ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 48 (5054) 13 снежня 2019 г. ISSN 0024-4686

16+

105! БДПУ маладзее стар. 4

Вершы, падобныя да сноў стар. 6

Дыялог: выдавецтва — чытач стар. 10

Феерверк пачуццёвасці і экспрэсіі

«Харошкі»: 45 гадоў узбагачаючы беларускую культуру

Фота Багдана Жоўценя.

Музычна-харэаграфічная кампазіцыя «Вечар у замку» з праграмы «Полацкі сшытак».

Адкрыць душу — як у спевах, зліцца ў руху — як у танцы… І атрымаць гэта ўсё разам. Магчыма? Вядома, калі на сцэне — Беларускі дзяржаўны акадэмічны заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі». Характары герояў абмалёўваюцца скрупулёзна, сэнс мае любы танцавальны эпізод, гармонія рухаў узнімае на крылах… Вось ужо 45 гадоў ансамбль адданы сваёй галоўнай ідэі — натхняць танцам, дорачы высокае мастацтва.

Створаны ў 1974 годзе пры Беларускай дзяржаўнай філармоніі, ансамбль паспяхова развівае найлепшыя традыцыі, дэманструючы паглыбленне ў эпоху, раскрываючы новыя гістарычныя грані. Стваральнік ансамбля, яго легендарны мастацкі кіраўнік і галоўны балетмайстар народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Валянціна Гаявая адмысловым творчым почыркам ператварае кожны нумар у жывы спектакль. Прыклад таму — урачысты святочны канцэрт з нагоды 45-гадовага юбілею «Харошак» у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

Працяг на стар. 5

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 19048

акцэнты тыдня

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў жыхароў Брэсцкай вобласці з 80-годдзем з дня яе ўтварэння. «Летапіс вашага краю багаты і старажытны. Тут не раз вырашаўся лёс Еўропы, адсюль родам многія выдатныя асобы: вучоныя, касманаўты, мастакі, паэты, дзяржаўныя дзеячы. Увесь свет помніць аб гераічным подзвігу абаронцаў Брэсцкай крэпасці і захапляецца рэліктавым хараством Белавежскай пушчы», — гаворыцца ў віншаванні. «Дзякуючы таленту і руплівасці жыхароў Брэст ператварыўся ў адзін з найпрыгажэйшых гарадоў краіны», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прыярытэты. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне, якім зацверджана рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Паводле дакумента, каля Br157 тыс. выдзелены на выплату 40 стыпендый, 37 прэмій, 52 заахвочвальных прэмій, 13 гранд-прэмій навучэнцам, студэнтам і творчым калектывам. Матэрыяльная дапамога аказана 153 прадстаўнікам таленавітай моладзі. Сярод іх — пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў у галіне музычнага, дэкаратыўна-прыкладнога, выяўленчага, харэаграфічнага, харавога і мадэльнага мастацтва. Прыняцце распараджэння — сведчанне ўвагі дзяржавы да пытанняў станаўлення таленавітай моладзі.

Юбілеі. Аляксандр Лукашэнка павіншаваў дырэктара Дзяржаўнага Эрмітажа Міхаіла Піятроўскага з 75-годдзем. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што на працягу многіх гадоў унікальны музейны комплекс, які ўзначальвае Міхаіл Піятроўскі, адпавядае высокім патрабаванням часу і застаецца вядучай установай сусветнага ўзроўню. «Вы паспяхова рэалізуеце сябе як на прафесійнай ніве, так і ў грамадска-палітычным жыцці. Вашы веды і вопыт у справе захавання і папулярызацыі нацыянальнага здабытку, гістарычных і сучасных каштоўнасцей свайго народа па праве прызнаны на радзіме і за мяжой», — адзначана ў віншаванні.

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў народную артыстку СССР Алісу Фрэйндліх з днём нараджэння. «Цалкам прысвяціўшы сябе мастацтву, Вы стварылі ў тэатры і кіно галерэю незабыўных вобразаў, дзякуючы якім Вас ведаюць і шчыра любяць гледачы розных краін і пакаленняў. Вашы ролі выпраменьваюць жыццялюбства і аптымізм, зачароўваюць багаццем пачуццяў, раскрываюць прыгажосць жаночай душы. Вы па праве з'яўляецеся адной з самых яркіх зорак сучаснасці», — гаворыцца ў віншаванні.

Праекты. Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» выпусціла кнігу «Кампазітары Беларусі. Мікалай Аладаў. Яўген Глебаў. Сяргей Картэс» у серыі «Вялікія і знакамітыя людзі беларускай зямлі», паведамляе БелТА. Прэзентацыя выдання адбылася падчас міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. У кнізе ў папулярнай форме паказаны жыццёвы шлях, музычная творчасць і дзейнасць трох выдатных беларускіх кампазітараў XX стагоддзя. У аснове выдання — унікальныя архіўныя дакументы, пісьмы, рукапісы, успаміны сучаснікаў.

Прэм'еры. Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа на камернай сцэне паказаў прэм'еру спектакля «Ваўкалак» паводле аднайменнага апавядання з кнігі Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Малады рэжысёр Ірына Тышкевіч узяла ў якасці сюжэта пастаноўкі апавяданне «Ваўкалак», таму што ўбачыла ў ім вельмі спрэчную маральную тэму — помсту. Да стварэння спектакля далучыліся мастак Юлія Карымава, харэограф Дзіяна Юрчанка і артысты-коласаўцы. У спектаклі выкарыстоўваецца беларускі фальклор, аўтэнтычныя песні.

Агляд афіцыйных падзей ад Раісы МАРЧУК

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Больш увагі, больш ініцыятыў

Адна з задач пісьменнікаў — папулярызаваць сучасных герояў, якія маглі б паслужыць прыкладам для моладзі. Такога меркавання прытрымліваліся ўдзельнікі сустрэчы з пісьменнікамі, якая прайшла падчас візіту расійскіх ваеначальнікаў і грамадскіх дзеячаў у Беларусь, прымеркаванага да 20-годдзя дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Сустрэчу, на якой абмяркоўваліся творчыя планы і літаратурныя конкурсы, арганізаваў сустаршыня Грамадскай палаты Саюзнай дзяржавы з боку Рэспублікі Беларусь, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец.

Гутарка тычылася і ролі пісьменнікаў у выхаванні маладога пакалення, ва ўмацаванні патрыятызму, захаванні гістарычнай памяці. Былі анансаваны дзве прэміі ад Грамадскай палаты і Саюза пісьменнікаў Саюзай дзяржавы да 75-годдзя Вялікай Перамогі. Пераможцы атрымаюць медалі і стыпендыі імя Сімяона Полацкага. Пісьменнік, аўтар гімна Саюзнай дзяржавы, генерал-маёр Іван Юркін і кампазітар, народны артыст Беларусі Эдуард Ханок расказалі пра свае ідэі да юбілею Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, сярод якіх — магчымасць правядзення міжнароднага песеннага конкурсу.

Значнае месца ў размове заняла тэма Чарнобыльскай катастрофы. Так, у складзе расійскай дэлегацыі прысутнічаў Мікалай Тараканаў, член Грамадскай палаты Саюзнай дзяржавы, генерал-маёр, доктар тэхнічных навук, кіраўнік аперацый па выдаленні высокарадыеактыўных элементаў з асабліва небяспечных зон Чарнобыльскай АЭС і аднаўленчых работ пасля

Фота Кастуся Дробава.

землятрусу ў Спітаку, аўтар больш як 30 кніг. Ён заўважыў, што тэме Чарнобыля ў літаратуры і кіно дагэтуль не ўдзелена належнай увагі, і нават вялікую папулярызатарскую работу — міні-серыял «Чарнобыль», у якім прататыпам аднаго з герояў стаў М. Тараканаў, — знялі за мяжой, а не ў Беларусі ці Расіі.

— Пісьменнікі мала пра гэта пішуць, — заўважыў Мікалай Чаргінец. — Дзе знайсці кнігі пра тых, хто выжыў і выратаваў свет? Мы заклікалі і заклікаем творцаў адгукнуцца на гэтую тэму. Магчыма, гэтаму паспрыяе спецыяльны конкурс.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Ад павятовай да раённай

Такі шлях прайшла Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева, якой споўнілася 100 гадоў.

У далёкім 1919 годзе кніжніца стала культурным і адукацыйным цэнтрам для ўсёй Барысаўшчыны. Перад вайной у ёй налічвалася больш як 30 тысяч кніг. Каб пашырыць дзейнасць кніжніцы, у вёскі адпраўляліся 50 перасоўных бібліятэк.

Сёння раённая бібліятэка — сацыякультурны цэнтр Барысаўскага рэгіёна, у складзе якога — 30 самых розных устаноў. Напрыклад, гарадская бібліятэка № 4 аб'ядноўвае аматараў сямейнага чытання, гарадская бібліятэка № 5 — спецыялізаваная, для інвалідаў па зроку. У вёсцы Лявонава размешчана бібліятэка-музей народнай творчасці і побыту.

Пра цікавасць барысаўчан да кнігі сведчаць штогадовыя лічбы: чытацкая аўдыторыя складае больш як 45 тысяч чалавек, кожны дзень кніжніцы Барысаўшчыны прымаюць звыш 1500 наведвальнікаў.

Не толькі сама кніга вабіць людзей (інфармацыйныя рэсурсы ў фондах складаюць 635 тыс. экзэмпляраў), але і шматлікія выстаўкі, прэзентацыі, сустрэчы з літаратарамі. Сучасныя бібліятэчныя навацыі пашыраюць кола зацікаўленых. Актыўна працуюць духоўна-асветніцкі цэнтр, зала літаратуры на замежных мовах, краязнаўчы цэнтр, сектар рэдкай кнігі, аддзел галерэйна-выставачнай дзейнасці і інш.

6 снежня стаў знакавым днём у стагадовай гісторыі ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева». На ўрачыстасць сабраліся яе супрацоўнікі, шматлікія чытачы, госці. Для ўсіх гэта радасная, кранальная падзея.

Сярод гасцей — і старшыня ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Мікалай Чаргінец, які выказаў пашану дырэктару ўстановы Алене Капыток і яе калегам. Мікалай Іванавіч перадаў словы падзякі ад пісьменніцкага саюза тым, хто нястомна працуе на карысць духоўнасці нашага грамадства, хто любіць і шануе кнігу.

Марыя ЛІПЕНЬ

праекты

Культурнае аблічча незалежнай Беларусі

ў дакументальна-ігравым фільме «Спадчына»

Культура беларусаў цікавая і шматгранная. Апошнім часам у краіне вялікую увагу надаюць яе папулярызацыі. Кожны тыдзень можна пачуць пра маштабныя мерапрыемствы, якія накіраваны на развіццё самых розных кірункаў культуры.

Так, напрыклад, у пачатку снежня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася прэзентацыя дакументальна-ігравога фільма «Спадчына». Стужка вытворчасці кінастудыі «Беларусьфільм» распавядае пра станаўленне маладой беларускай дзяржавы і дасягненні, якімі можа ганарыцца наша грамадства.

Рэжысёр фільма — аўтар больш чым 80 дакументальных фільмаў і тэлепраграм, уладальнік шматлікіх прафесійных узнагарод Людміла Клінцова. Аўтарам сцэнарыя выступіла вядомая беларуская пісьменніца, лаўрэат Нацыянальнай прэміі па драматургіі, кандыдат гістарычных навук Наталля Голубева.

У цэнтры ўвагі стваральнікаў карціны — не толькі цяжкасці, з якімі сутыкнулася краіна на шляху незалежнасці ў 1990-я гады, але і ключавыя рашэнні аб падтрымцы нацыянальнай культуры, узнаўленні гістарычнага аблічча краіны і будаўніцтве знакавых аб'ектаў. Нездарма пляцоўкай для прэм'еры стала Нацыянальная бібліятэка Беларусі — візітка краіны.

— Пра беларускую культуру можна казаць бясконца. Можна было зняць не адзін фільм, а дзесяць — настолькі шматгранная наша спадчына. Мы пайшлі на смелы эксперымент, — расказала Людміла Голубева. — Вельмі хацелася зрабіць фільм, у якім было б усё галоўнае і ўнікальнае, чым можам ганарыцца. Для гісторыі гады незалежнасці Беларусі — імгненне, а тое, што мы змаглі зрабіць за гэты час, не проста ўражвае, а выклікае захапленне, гонар за людзей, якія сваім талентам, працай аднаўлялі гістарычнае аблічча краіны, стваралі новую незалежную Беларусь.

Фільм распавядае пра Полацкі гісторыка-культурны запаведнік, выратаваныя ад разбурэння Мірскі і Нясвіжскі замкі, пра тое, як атрымалася ажыццявіць маштабную рэканструкцыю Вялікага тэатра оперы і балета, тэатра імя Янкі Купалы, Нацыянальнага мастацкага музея, аднавіць на беларускіх землях вытворчасць слуцкіх паясоў, пра багатую духоўную спадчыну краіны — унікальныя калекцыі і зборы карцінных галерэй. У кадры з'яўляюцца людзі, знакавыя для беларускай культуры: архітэктар Віктар Крамарэнка, балетмайстар Валянцін Елізар'еў, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі, рэжысёр Мікалай Пінігін і іншыя дзеячы мастацтва.

Вікторыя АСКЕРА

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

***15 снежня** — на сустрэчу з народным пісьменнікам Азербайджана Чынгізам Абдулаевым у Дом літаратара (15.00).*

***15 снежня** — на пасяджэнне аб'яднання «Акорд» пры дзіцячай бібліятэцы № 2 (15.00).*

***17 снежня** — на імпрэзу, прысвечаную Дню незалежнасці Рэспублікі Казахстан, у Дом дружбы (17.00).*

***18 снежня** — на ўрокі літаратуры з удзелам Анатоля Зэкава ў гімназію № 10 (15.00).*

***18 снежня** — на сустрэчу з Людмілай Воранавай у СШ № 53 (13.45).*

***18 снежня** — на імпрэзу «Паэтычнае канфеці» ў Мінскі гарадскі Тэатр паэзіі пры Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Янкі Купалы (17.30).*

***19 снежня** — на паказ кінастужкі «Лекі для Веры» ў Дом літаратара (12.00).*

***19 снежня** — у экалагічнае падарожжа да 80-годдзя заснавання Нацыянальнага парка «Белавежская пушча» ў Музей пад адкрытым небам пры дзіцячай бібліятэцы № 15 (12.00).*

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***14 снежня** — на пасяджэнне клуба «Жарынка» з удзелам Настассі Нарэйкі ў рэдакцыю газеты «Навіны Камянеччыны» (12.00).*

***19 снежня** — на прэзентацыю дзіцячых кніг у межах праекта «Літаратурная альтанка» ў Брэсцкую дзіцячую бібліятэку імя А. С. Пушкіна (12.00).*

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***16 снежня** — на сустрэчу з Галінай і Сяргеем Трафімавымі ў СШ № 8 г. Оршы (10.00).*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***17 снежня** — на сустрэчу з Ірынай Карнаухавай у Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці (16.00).*

***18 снежня** — на пасяджэнне грамадскага дыскусійнага клуба «Словадром» на тэму «Мой голас» у Гродзенскую абласную бібліятэку (17.00).*

***19 снежня** — на заняткі Гродзенскай грамадскай літшколы ў офіс СПБ (17.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***17 снежня** — на сустрэчу Алеся Казекі з навучэнцамі ў Магілёўскую гарадскую гімназію № 1 (14.00).*

***19 снежня** — на імпрэзу «Душа любіць мой горад не стамляецца» з удзелам Міколы Леўчанкі ў бібліятэку мікрараёна Быхаў-1 (14.30).*

***19 снежня** — на літаратурны час «Сцяжынкамі вайны» па творчасці Ніны Кавалёвай у Цемналескую бібліятэку-філіял Дрыбінскага раёна (10.00).*

Мінскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***14 снежня** — на сустрэчу «Ракаўскі летапісец» да 100-годдзя з дня нараджэння Васіля Налецкага ў гасцёўню аб'яднання «Рунь» у Валожынскі раённы цэнтр культуры (12.00).*

***18 снежня** — на сустрэчу з Людмілай Круглік у Дзяржынскую райбібліятэку (17.00).*

З нагоды

Паказаць беларускую жанчыну як асобу

Часопіс «Алеся» адзначыў 95-годдзе

Многія перыядычныя выданні Беларусі маюць даўнюю гісторыю і традыцыі. На мінулым тыдні беларускі часопіс для жанчын «Алеся» адзначыў 95-годдзе з дня выхаду. Адно з найстарэйшых беларускіх перыядычных выданняў заснавана ў 1924 годзе па ініцыятыве жаночага аддзела ЦК КПБ(б) і насіла назву «Беларуская работніца і сялянка», пазней змяніла яшчэ некалькі назваў: «Беларуская работніца і калгасніца», «Работніца і сялянка». Сённяшняе імя часопіс атрымаў у 1995 годзе.

Першым галоўным рэдактарам жаночага часопіса была Марыя Муратава, якая пасля ўступлення ў камуністычную партыю ў сямнаццацігадовым узросце актыўна займалася ліквідацыяй непісьменнасці.

Святкаванне прайшло ва ўрачыстай атмасферы — у Нацыянальным мастацкім музеі, пад гукі класічнай музыкі. Да гэтага свята музей зладзіў выстаўку твораў, аўтаркі якіх праславілі беларускае мастацтва XX стагоддзя. Музычнае аздабленне імпрэзы забяспечылі навучэнцы і выпускнікі Маладзечанскага музычнага каледжа імя Агінскага.

Асноўная мэта часопіса застаецца нязменнай на працягу ўсяго часу яго існавання — паказаць беларускую жанчыну як асобу. Прывітальныя словы і віншаванні калектыву часопіса накіравалі шматлікія госці і першыя асобы рэспублікі.

«Выданне і сёння робіць важкі ўклад у стварэнне светлага і высакароднага вобраза беларускай жанчыны, выхаванне нашай моладзі і папулярызацыю сямейных каштоўнасцей. Упэўнены, што і надалей творчы калектыў часопіса будзе верны свайму прафесійнаму абавязку і добрым традыцыям», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка ў віншавальным адрасе, які зачытаў намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Андрэй Кунцэвіч.

Фота Кастуся Дробава.

Ігар Бузоўскі перадае віншаванне ад міністра інфармацыі Аляксандра Карлюкевіча рэдактару «Алесі» Ларысе Ракоўскай.

Віншаванні ад міністра інфармацыі Аляксандра Карлюкевіча разам з падзякай калектыву часопіса перадаў намеснік міністра Ігар Бузоўскі. Па яго меркаванні, разам з юбілеем часопіса грамадства адзначыла ролю жанчыны як у жыцці дзяржавы, так і ў жыцці кожнага асобнага мужчыны. «Сёння "Алеся" робіць важкі ўклад у рэалізацыю ў грамадстве ролі жанчын, распавядаючы сваім чытачам аб сямейных каштоўнасцях, раўнапраўі, сацыяльнай падтрымцы і дасягненнях жанчын», — сцвердзіў у прывітальным адрасе міністр інфармацыі.

Таксама з віншаваннямі да калектыву часопіса звярнуліся Марыяна Шчоткіна, старшыня ГА «Беларускі саюз жанчын», нязменнага партнёра «Алесі»; Павел Сухарукаў, дырэктар РВУ «Выдавецкі дом "Звязда"», пад крылом якога цяпер знаходзіцца часопіс; Таццяна Філімонава, старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму, Аляксандр Пятровіч, дырэктар Вялікага тэатра оперы і балета, прадстаўнікі Нацыянальнага мастацкага музея і іншыя госці.

На святкаванні, якое прайшло пад назвай «Жанчына — трапяткі сусвет», шмат размаўлялі пра мінулае, пра гісторыю часопіса, пра неўтаймаваную энергію жанчын, якія стваралі яго 95 гадоў таму і падтрымлівалі яго існаванне і актыўнае жыццё. Асаблівым момантам мерапрыемства стала запрашэнне да мікрафона траіх былых галоўных рэдактараў — Марыю Карпенка, Раісу Баравікову і Тамару Бунту. Напрыканцы свайго выступлення Марыя Карпенка прамовіла: «У мяне адна просьба — запрасіце на 100-годдзе!» Думка пра імклівае набліжэнне стогадовага юбілею часопіса лунала ў паветры на працягу ўсяго мерапрыемства. Атрымліваецца, што б ні адзначалі разам з юбілеем часопіса — ці трывалась і шматгадовую гісторыю беларускіх перыядычных выданняў, ці ролю і значнасць жанчын у грамадстве і ва ўсіх аспектах жыцця — галоўнае — тое, што калектыў выдання працягвае глядзець наперад, у будучыню, таму яго праца патрэбная і актуальная.

Дар'я СМІРНОВА

імпрэзы

Папоўніць кнігу паступленняў

Выстаўка «КП — 2019», куратарская экскурсія, ларп «Гісторыі з жыцця Максіма», камерны канцэрт Пятра Клюева — такімі падзеямі запомнілася святкаванне 128-годдзя з дня нараджэння паэта ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча.

— Кожны год мы адзначаем дзень нараджэння нашага вялікага паэта. Але не хацелася б праводзіць яго неяк будзённа, бо гэта нагода вырвацца з руціны і падумаць пра прыгожае. Кожны раз спрабуем дадаваць нешта новае, — адзначыў загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Міхаіл Бараноўскі падчас адкрыцця выстаўкі «КП — 2019».

Святкаванне пачалося з ларпа «Гісторыі з жыцця Максіма» — ролевай гульні жывога дзеяння, падчас якой удзельнікі паглыбляюцца ў розныя сітуацыі і прымяраюць на сябе незвычайныя ролі. Акрамя таго музей традыцыйна прадставіў невялікую дакументальную выстаўку, прысвечаную фондавым паступленням. «КП — 2019» атрымала сваю назву дзякуючы кнізе паступленняў — галоўнаму дакументу музея. Раней гэтыя кнігі вяліся ад рукі, туды запісваліся кароткія анатацыі аб прадметах: памеры, год стварэння, крыніца паступлення і інш. Прадстаўленыя на выстаўцы экспанаты былі падараваныя. З найбольш каштоўных — узоры вышыўкі стрыечных сясцёр М. Багдановіча, а таксама знойдзены нядаўна аўтограф Адама Багдановіча. У экспазіцыі — кніга Паўла Шэйна, у якой змешчаны этнаграфічныя матэрыялы А. Багдановіча і яго маці Рузаліі, па якіх, магчыма, вучыўся М. Багдановіч.

Дарэчы, падчас святкавання фонды музея зноў папоўніліся. Аксана Аракчэева, дачка жывапісца Барыса Аракчэева, падаравала адзін з эскізаў бацькі (арыгінал захоўваецца ў Магілёўскім мастацкім музеі). Неўзабаве з'явіцца яшчэ адзін экспанат — фотаздымак, на якім А. Багдановіч, Максім Горкі, дырэктар Ніжагародскай гімназіі Сяргей Шчарбакоў і іх сем'і сустракаюць новы год. Праўнук С. Шчарбакова Раман Чалаў паабяцаў перадаць яго музею.

Яўгенія ШЫЦЬКА

зваротная сувязь

На літаратурных хвалях

Усуботу на канале «Культура» Беларускага радыё выйдзе праграма «Кнігалюбу», у якой чакаецца сустрэча з крытыкам, літаратуразнаўцам Яўгенам Гарадніцкім.

Аматарам тэатра перад мікрафонам у суботнім эфіры прапануецца праграма «Радыётэатр. Лепшае» (да 100-годдзя Купалаўскага тэатра), дзе прагучыць радыёкампазіцыя спектакля тэатра імя Янкі Купалы «На крутым павароце» па аднайменнай камедыі Канстанціна Губарэвіча. У нядзелю слухайце другую частку радыёспектакля «Пігмаліён» паводле Бернарда Шоу.

Таксама ў нядзелю прапануецца публіцыстычны праект «Запрашаем у кнігарню», у якім пойдзе размова пра новыя кнігі розных выдавецтваў, інтэрв'ю з выдаўцом Уладзімірам Сіўчыкавым. Асобнае месца зойме расповед пра «ЛіМ». Радыёверсія тэлепраграмы «Суразмоўцы» прагучыць на канале «Культура» таксама ў нядзелю. Гэтым разам вядучы Навум Гальпяровіч запрасіў на размову паэта, рэдактара, перакладчыка Пятра Жаўняровіча.

У выхадныя можна паслухаць вершы Міхала Бараноўскага ў праграме «Паэзія XXI стагоддзя». Праект «Паэтычная раніца» прапануе радыёкампазіцыю паводле вершаў Людмілы Рублеўскай і Адама Міцкевіча.

У літаратурна-мастацкай праграме для аматараў прозы «Літаратурная анталогія» артыст Алег Вінярскі будзе чытаць «Мёртвыя душы» Мікалая Гогаля (да 210-годдзя з дня нараджэння пісьменніка). А з 16 снежня ў праграме «Радыёбібліятэка» будзе гучаць твор Пятра Васючэнкі «Дванаццаць подзвігаў Геракла» ў выкананні артысткі Алены Сідаравай. У вячэрнім эфіры выхадных выйдуць новыя выпускі праграмы «Літаратурныя гісторыі». Так, у суботу слухайце апавяданне Таісы Супрановіч «Парэчкі», якое прачытае Маргарыта Захарыя.

З праграмай радыёперадач можна азнаёміцца на сайтах Белтэлерадыёкампаніі і канала «Культура».

ЛіМ КАЛЯНДАР

14 снежня 75 гадоў спаўняецца Анатолю Марышаву, мастаку, графіку.

15 снежня — 125 гадоў з дня нараджэння Саламона Юдовіна, графіка.

15 снежня 80-гадовы юбілей святкуе Рыгор Несцераў, мастак.

15 снежня 80-годдзе адзначае Уладзімір Чарнышоў, мастак кіно і тэатра.

16 снежня — 220 гадоў з дня нараджэння Яна Баршчэўскага, паэта, празаіка.

16 снежня — 110 гадоў з дня нараджэння Якава Кімберга, народнага артыста БССР.

16 снежня — 85 гадоў з дня нараджэння Леаніда Анцімонава, графіка, педагога.

16 снежня 80 гадоў спаўняецца Алегу Зьнічу, паэту, публіцысту, філосафу.

17 снежня — 130 гадоў з дня нараджэння Данілы Васілеўскага, краязнаўца, гісторыка, літаратуразнаўцы.

17 снежня — 115 гадоў з дня нараджэння Мікалая Яромушкіна, празаіка.

17 снежня — 105 гадоў з дня нараджэння Веніяміна Рудава, празаіка.

17 снежня — 95 гадоў з дня стварэння Белдзяржкіно (Беларускае дзяржаўнае ўпраўленне па справах кінематаграфіі і фатаграфіі). Існавала да 1938 г.

18 снежня — 220 гадоў з дня нараджэння Мікалая Маліноўскага, гісторыка, архівіста, публіцыста.

18 снежня — 100 гадоў з дня нараджэння Генрыха Лейбмана, кінааператара.

19 снежня — 100 гадоў з дня нараджэння Мікалая Пятрэнкі, кампазітара, заслужанага настаўніка БССР.

19 снежня — 90 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Табушава, графіка.

19 снежня — 80 гадоў з дня нараджэння Мікалая Рыжыкава, графіка.

20 снежня — 115 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Даброціна, заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР.

20 снежня — 105 гадоў з дня нараджэння Вольгі Фурс, заслужанай артысткі Бурацыі.

люстэрка тыдня

Доўгачаканы фільм «Купала» пакажуць у Дзень беларускага кіно. Як паведамляе агенцтва «Мінск-навіны», яго прэзентуюць 17 снежня на закрытым перадпрэм'ерным паказе ў кінатэатры «Масква». Гістарычная драма расказвае пра лёс народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. У карціне раскрываюцца асноўныя вехі жыццёвага і творчага шляху паэта, які супаў з трагічнымі падзеямі XX стагоддзя. Першымі гледачамі стануць ганаровыя госці, прадстаўнікі кінематаграфічнай грамадскасці і СМІ. Рэжысёр Уладзімір Янкоўскі асабіста прадставіць праект. Трэйлер ужо прэзентаваны на AFM — сусветным кінарынку ў Лос-Анджэлесе, а таксама на міжнародным кінафестывалі ў Хайнане. У наступным годзе плануецца прадставіць «Купалу» на фестывалях класа А. У пракаце стужка з'явіцца толькі ў другой палове 2020 года.

Камітэт прэміі «Залаты глобус» абвясціў спіс намінантаў па выніках 2019 года, паведамляе «МІР 24». Серыял «Чарнобыль» прэтэндуе на «Залаты глобус» у катэгорыі «Найлепшы міні-серыял або тэлефільм». У гэтай намінацыі з «Чарнобылем» сапернічаюць стужкі «Фосі / Вердан», «Улоўка-22» Джорджа Клуні, «Самы гучны голас» пра заснавальніка Fox News Роджэра Эйлса. За званне найлепшага драматычнага фільма будуць змагацца «Ірландзец», «Шлюбная гісторыя», «Два таты», «1917» і «Джокер». Таксама на цырымоніі будзе ўручана ўзнагарода за ўклад у кінематограф, якую атрымае васьміразовы ўладальнік «Залатога глобуса» і 15-разовы намінант Том Хэнкс. 77-я ўрачыстая цырымонія ўручэння прэміі «Залаты глобус» адбудзецца 5 студзеня 2020 года.

Па кнізе Пола Макартні здымуць анімацыйны фільм. Netflix плануе экранізаваць кнігу «Высока ў аблоках», што выйшла ў 2005 годзе, распавядае РІА «Новости». Суаўтары выдання — дзіцячы пісьменнік Філіп Арда і мультыплікатар Джэф Данбар. Кніга напісана ў жанры казачнай аповесці і расказвае аб прыгодах ваверчаняці Вілі і яго сяброў. Твор адразу прывабіў вялікую чытацкую аўдыторыю ў Англіі, таму перакладаўся на многія мовы. Рускі варыянт з'явіўся амаль адразу пасля выхаду. У стварэнні мультфільма возьме ўдзел французская кінастудыя *Gaumont*. Рэжысёрам выступіць намінант на прэмію «Оскар» Цімаці Рэкарт. У стужцы прагучаць арыгінальныя песні Beatles.

У Маскве, у Доме Пашкова, ўзнагародзілі лаўрэатаў 14 сезона Нацыянальнай літаратурнай прэміі «Большая книга», паведамляе РІА «Новости». Першая месца заняла біяграфія «Венедзікт Ерафееў: чужы» Алега Лякманава, Міхаіла Свярдлова і Ільі Сіманоўскага. Другое месца ў Грыгорыя Служыцеля за кнігу «Дні Савелія», а трэцяе — у Гузелі Яхінай за раман «Дзеці мае». Сёлета ў спіс фіналістаў увайшло 12 твораў. Сярод іх — «Рай зямны» Сухбата Афлатуні, «Сабакі Еўропы» Альгерда Бахарэвіча, «Сабачы лес» Аляксандра Ганароўскага і іншыя. Раней прэмія «Большая книга» падвяла вынікі чытацкага галасавання, пераможцам якога стала Гузель Яхіна. Сёлетнюю прэмію арганізатары прысвяцілі Году тэатра.

Бэнксі намаляваў калядна-сацыяльнае графіці ў Бірмінгеме ў Вялікабрытаніі. Пра гэта стала вядома найперш дзякуючы роліку, які мастак размясціў у сваім профілі ў *Instagram*. У цэнтры ўвагі на відэа — бяздомны мужчына, які нешта п'е і кладзецца спаць на лаўцы пад акампанемент кавера на песню Фрэнка Сінатры «Я буду дома на Каляды» амерыканскай спявачкі Джэй Уільямс. Калі камера ад'язджае, гледач бачыць графіці са срэбнымі аленямі, якія імчацца ўвысь. Лаўка з бяздомным стала баццам бы прывязаная да запрэжкі, адсылаючы гледача да вобраза саней Санта Клауса. Бэнксі, які лічыцца мастаком-загадкай, правакатарам, змяніў масавае ўяўленне пра вулічнае мастацтва.

Агляд цікавінак ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Мікола ШАБОВІЧ:

«Заўсёды былі, ёсць і будуць студэнты, для якіх беларуская мова святая»

Гэты год стаўся юбілейным для паэта, лаўрэата Рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты Купідон» і Міжнароднай літаратурнай прэміі імя С. А. Ясеніна Міколы Шабовіча. У студзені ён адсвяткаваў свой 60-гадовы юбілей, у сакавіку споўнілася 40 гадоў створанаму ім літаратурнаму аб'яднанню «Крокі». Зараз Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка святкуе 105-годдзе. Менавіта ў гэтай ўстанове Мікола Шабовіч працуе ўжо 30 гадоў. Сапраўды, цудоўная нагода сустрэцца з творцам, каб пагаварыць пра жыццё, творчасць і родны ўніверсітэт.

Фота з асабістага архіва Міколы Шабовіча.

— Мікола Віктаравіч, вы аўтар сямі паэтычных кніг. Ці не хочацца паспрабаваць сябе ў іншым напрамку? Ці мо працуеце над восьмай?

— Апошнім часам шмат займаўся перакладамі з рускай паэзіі. Класічнай і сучаснай. А таксама перакладамі з сучаснай рускамоўнай паэзіі Беларусі. Усяго пераклаў каля 500 твораў. Дасць Бог, нешта з'явіцца ў друку ў наступным годзе. Але гэта залежыць не толькі ад мяне. Стараюся не запускаць і ўласную творчасць. Дарэчы, з некаторымі новымі вершамі нядаўна знаёміліся чытачы «ЛіМа». Не ганюся за колькасцю — чакаю таго моманту, калі радкі нібы самі дыктуюцца з неба. І пакуль натхненне не пакідае, магу напісаць за адзін дзень (ці адну ноч) некалькі вершаў. Памятаю, аднойчы пайшоў у парк Чалюскінцаў і з ранку да вечара нарадзіў ажно пяць вершаў. На прыпынак ужо ішоў, як кажуць, «на аўтапілоце». Гэта ў той незабыўны дзень з'явіўся адзін з найбольш удалых твораў. *«Гады, гады... Не вернуцца яны, / Хіба прысняцца толькі на хвіліну / Пад клёнаў шум, гаючы шум лясны, / Пад ветру спеў, пад посвіст салаўіны»*. Наогул, люблю пісаць лежачы. Паколькі я сава, то большасць вершаў створана ўсё ж ноччу. Калі не пішуцца свае вершы, то перакладаю любімыя творы іншых паэтаў. Быў час, калі я захапляўся пародыямі і эпіграмамі. Вынік такога захаплення — дзве кнігі, адна з якіх уганаравана Рэспубліканскай літаратурнай прэміяй «Залаты Купідон».

— Помніце, пра што быў ваш першы верш?

— Такое не забываецца. Мяне, васьмікласніка Дзягільскай васьмігадовай школы, адправілі на раённую алімпіяду па хіміі. Аўтобус да Мядзела прыпазніўся, і я зайшоў апошнім у памяшканне, дзе праводзілася алімпіяда. Бачылі б вы маю разгубленасць, калі я заўважыў, што ўсе месцы (за партамі сядзелі па адным) былі занятыя. Арганізатары суцяшалі, маўляў, знойдзем месца, і падсадзілі за першую парту да чароўнай бялявай дзяўчынкі, тым самым вызначыўшы ў многім мой далейшы лёс. Замест таго, каб рашаць хімічныя задачы, я думаў пра маю сімпатычную суседку, як яе завуць, з якой яна школы... Коса пазіраў у яе запісы, а яна, мабыць, думала, што хачу спісаць у яе хімію, і таму, як магла, захіналася ад мяне. Не ведаю, ці перамагла яна ў алімпіядзе. Я, канечне, не. Але ж вечарам я быў самым шчаслівым чалавекам у свеце, бо напісаўся мой першы верш. *«Все оксиды, кислоты и соли / Реагируют только с тобой…»*. Да сённяшняга часу тэма кахання для мяне асноўная.

— Але вы працуеце і ў песенным жанры...

— І з прафесійнымі, і з самадзейнымі кампазітарамі мы напісалі каля дзвюх соцень песень, некаторыя з іх у свой час дэбютавалі на фестывалях у Маладзечне і Віцебску, а потым часта гучалі па радыё і тэлебачанні, як, напрыклад, «Залатыя арэлі сноў» у выкананні Алесі Гайдук (кампазітар Алег Елісеенкаў), «Будзь маёй» у выкананні Дзмітрыя Мінько (кампазітар Алена Атрашкевіч), «Малады казак» у выкананні Ірыны Дарафеевай (кампазітар Уладзімір Сарокін), «Люся» (кампазітар і выканаўца Алег Цівуноў). Многія творы сабраны па магнітаальбомах. Песень 40 (а мо і 50) напісаў на мае вершы кампазітар і выканаўца Алег Малашчыцкі, больш за 30 песень створана ў суаўтарстве з кампазітарам Міколам Яцковым, і гэта далёка не ўсё. Апошнім часам вельмі плённа супрацоўнічаю з таленавітым пінскім кампазітарам і спеваком Віктарам Мяцельскім, а таксама мінскім кампазітарам Аляксандрам Страцэўскім. Нашы песні вельмі цёпла прымае сталічная публіка. Хочацца падзякаваць і даўнім сябрам Дзмітрыю Пятровічу і Анатолю Міхальчэнкаву, якія напісалі музыку не толькі на многія мае лірычныя вершы, але і на пародыі. За музычную інтэрпрэтацыю маёй паэзіі я ўдзячны многім, спіс можна працягваць доўга.

— Яшчэ ў студэнцкія гады вы стварылі літаратурнае аб'яднанне «Крокі». Назавіце найбольш вядомых выпускнікоў аб'яднання. Хто ў большай ступені апраўдаў і апраўдвае вашы надзеі?

— Стварыў не толькі я, але і мае паплечнікі. Назву аб'яднанню даў мой тагачасны аднайменны верш. З таго ж верша вырас і дэвіз: «Крочыць, каб потым застаўся след!» Выпускнікамі сталі вядомыя ўжо сёння літаратары, а тады, у 1979 годзе, першакурснікі Мікола Ждановіч і Мікола Мікуліч. Зборнік вершаў выдала іх аднакурсніца Людміла Харужык (Глінская). Выпускнікі аб'яднання пазнейшых гадоў плённа працуюць у паэзіі і прозе: Дзмітрый Пятровіч, Таццяна Сівец, Сяргей Карчыцкі, Ганна Міклашэвіч, Таццяна Старасценка, Аксана Ярашонак-Камінская, Яна Явіч, Ксенія Шаржановіч, Таццяна Выскварка, Ірына Чарняўская, Вераніка Мандзік… На жаль, рана пайшла з жыцця паэтка і празаік Ганна Васільева-Давідовіч, якая падавала вельмі вялікія надзеі.

— Вы працавалі настаўнікам у школе, але пачалі выкладаць ва ўніверсітэце. Чаму?

— Усё даволі проста: падчас працы ў школе я здаваў кандыдацкі мінімум, а калі з'явілася месца ў вочнай аспірантуры, мяне паклікалі туды. І пасля заканчэння аспірантуры пакінулі на працы. Тут абараніў кандыдацкую дысертацыю, тут працую і сёння.

— Ці атрымліваеце водгукі аб сваёй творчасці ад студэнтаў?

— Стараюся на занятках сваю творчасць (маю на ўвазе паэтычную) не дэманстраваць. Выступаю толькі на літаратурных вечарах ва ўніверсітэце і паза ім: у музеях, бібліятэках. Часам такія імпрэзы наведваюць і студэнты. Бачу па вачах, што ім падабаюцца мае вершы, а таксама песні на мае словы. Бывае, што выказваюць прыхільнасць да маіх аўдыя- і відэазапісаў лайкамі ў сацыяльных сетках.

— Час змяняецца. Ён накладвае свой адбітак і на мову ды літаратуру, і на падыходы да іх выкладання. Здаецца, гэта не можа быць заўважна па моладзі, якая вучыцца ва ўніверсітэце. Ці бачыце нейкія змены ў стаўленні студэнтаў да роднай мовы?

— Асаблівых зменаў не бачу, бо заўсёды былі (ёсць і, напэўна, будуць) тыя студэнты, для якіх беларуская мова святая з малых гадоў дзякуючы бацькам, настаўнікам, сябрам, добрым кнігам добрых пісьменнікаў, як кажуць, апосталаў нацыі. А таксама былі (ёсць і, мабыць, таксама будуць) тыя, хто яшчэ да канца не зразумеў значэнне роднай мовы. Асабліва крыўдна, калі гэтага не разумее будучы выкладчык роднай мовы і літаратуры.

> **...трэба выхоўваць павагу і любоў да Радзімы, да беларускай мовы і літаратуры, шчырасць, адданасць бацькоўскай зямлі. Гэтыя ж рысы варта выхоўваць не толькі ў студэнтаў-філолагаў, але і ў кожнага чалавека. Прычым з малых гадоў.**

— У чым істотныя адрозненні цяперашніх студэнтаў ад студэнтаў, з якімі працавалі 10—15 гадоў таму?

— Істотных, бадай, няма. У кожны час ёсць тыя студэнты, якія свядома абралі прафесію і ідуць да сваёй мэты. У адных нешта атрымліваецца лепш, у іншых — горш. Для кагосьці педпрактыка — радаснае свята, а для кагосьці — экзамен на прафесійную прыдатнасць. Своеасаблівае выпрабаванне. І тады, і сёння ёсць і першыя, і другія. На жаль, апошнім часам прыходзіць усё менш абітурыентаў, якія пішуць вершы, апавяданні. І гэта мяне турбуе і непакоіць.

— Ці супадаюць вашы хваляванні як выкладчыка з трывогамі студэнтаў?

— Пра студэнцкія трывогі лепш спытаць у саміх студэнтаў. Але мяркую, што ў нас могуць быць і агульныя трывогі-перажыванні. Часам на пэўныя дысцыпліны (у тым ліку і спецыяльныя) вылучаецца невялікая колькасць гадзін. Асабліва на завочным навучанні. Лічыцца, што маладыя людзі ў школе дастаткова добра засвоілі родную мову. Насамрэч гэта далёка не так. Трывожыць пэўная пасіўнасць студэнтаў, слабая арыентацыя ў сучасным літаратурным працэсе. Падчас майго студэнцкага жыцця лічылася за норму падпіска на беларускія літаратурныя часопісы, газету «Літаратура і мастацтва». Сённяшняя моладзь далёка не заўсёды знаходзіцца ў курсе літаратурнага жыцця краіны. А цяжкасці, бадай, пастаянныя. У сутках толькі 24 гадзіны. Ужо не кажучы пра канкрэтныя заняткі, абмежаваныя 45 ці 90 хвілінамі. Шмат на што не хапае часу.

— Што перш-наперш трэба выхоўваць у студэнце-філолагу? Чаго ўвогуле не хапае сённяшняй моладзі?

— Любоў да кнігі і свайго прадмета. Не абмяжоўвацца выключна заняткамі і падрыхтоўкай да іх. Вельмі карысна наведваць розныя літаратурныя вечарыны, знаёміцца з пісьменнікамі, браць у іх аўтографы, рабіць здымкі на памяць. Усё гэта спатрэбіцца падчас працы ў школе. Варта наведваць тэатры, асабліва пастаноўкі па творах школьнай праграмы. Гэта таксама будзе дапамагаць пры выкладанні прадмета, рабіць заняткі цікавымі, змястоўнымі і разнастайнымі. Безумоўна, кожны выкладчык універсітэта павінен задумвацца пра маладую змену, пра тых, хто пойдзе ў магістратуру і аспірантуру і потым стане не толькі добрым выкладчыкам, але і таленавітым навукоўцам, аўтарам падручнікаў і дапаможнікаў. А наогул, трэба выхоўваць павагу і любоў да Радзімы, да беларускай мовы і літаратуры, шчырасць, адданасць бацькоўскай зямлі. Гэтыя ж рысы варта выхоўваць не толькі ў студэнтаў-філолагаў, але і ў кожнага чалавека. Прычым з малых гадоў.

— Як творцу, як выкладчыка — што натхняе вас у вучэбным працэсе?

— Радуе магчымасць кантактаваць з маладымі людзьмі, па сутнасці, інтэлектуальнай будучыняй Беларусі, магчымасць падзяліцца сваімі ведамі, а таксама нечаму і навучыцца ў іх. Радуюць творчыя адносіны многіх студэнтаў да прадмета. Радуюць і натхняюць іх розум і малады імпэт. Прыемна пачуць ад студэнтаў словы ўдзячнасці пасля заняткаў.

— Напрыканцы традыцыйнае пытанне: што дала вам праца ў педуніверсітэце? Як ён змяняецца з цягам часу?

— 42 гады таму я паступіў вучыцца ў гэтую ўстанову адукацыі, тады яшчэ Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага. Закончыўшы яго і адпрацаваўшы 5 гадоў настаўнікам Шыпкоўскай васьмігадовай школы Вілейскага раёна, вярнуўся сюды ў аспірантуру, пасля паспяховага заканчэння якой вось ужо 30 гадоў (палову свайго жыцця!) выкладаю родную мову. Тут прайшоў шлях ад асістэнта да дацэнта, абараніў кандыдацкую дысертацыю. Тут атрымалі «пасведчанні аб нараджэнні» многія мае вершы. Не на занятках, канечне. Пісаліся ў студэнцкім інтэрнаце, потым ужо ва ўласнай мінскай кватэры, у парках горада, на маёй малой радзіме… Дарэчы, там, у маіх Бадзенях, нарадзіўся цыкл вершаў «Твая прафесія Настаўнік», і нарадзіўся не проста так, а па просьбе рэктара ўніверсітэта Аляксандра Іванавіча Жука, якому я вельмі ўдзячны. Таксама я аўтар слоў гімна БДПУ, які выконваецца на розных урачыстасцях. Прыемна, што мая праца адзначана нагрудным знакам «За ўклад у развіццё БДПУ», а таксама граматамі і дыпломамі. Ці змяняецца ўніверсітэт? Канечне. І толькі ў лепшы бок. Мне падаецца, што з кожным годам ён прыгажэе і маладзее.

Гутарыла Яўгенія ШЫЦЬКА

Феерверк пачуццёвасці і экспрэсіі

Хтосьці мудры сказаў, што, калі малюеш галінку, трэба чуць дыханне ветру. Думаецца, каб танцаваць, трэба чуць мелодыю сэрца. Без сумненняў, гэтым вось ужо 45 гадоў кіруецца Беларускі дзяржаўны акадэмічны заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі». Выступленні ансамбля даюць імпульс, здольны зварухнуць планеты: вытанчаныя рухі ачышчаны ад усяго лішняга, выпадковага. А калі гэта яшчэ дапаўняецца вакальным суправаджэннем, усё працуе на выразную ідэю — скалыхнуць, заахвоціць да ўнутранага абуджэння.

Сёння ў «Харошках» многа моладзі, але працуюць і карыфеі калектыву — майстры, якія стаялі каля вытокаў стварэння ансамбля, а цяпер з'яўляюцца яго гонарам. Сярод іх — заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь Фёдар Балабайка, Святлана Кашталапава-Патаповіч, Алеся Кур'ян, а таксама знаныя віртуозы Валянціна Гехт, Андрэй Асаёнак і, вядома, нязменны мастацкі кіраўнік — народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Валянціна Гаявая, якая сваімі творчымі знаходкамі дорыць гледачам бясконцае натхненне:

— Я іншага не ўмею: не пяю, не іграю ні на чым, а гэта — маё (шукаць і знаходзіць. — **Н. С.**), — гаворыць Валянціна Іванаўна. — Я адчуваю любоў да людзей, да прыроды, да Беларусі — яна мне вельмі падабаецца. І гісторыя. «Полацкі сшытак» як з'явіўся? Зрабіла шмат танцаў фальклорных, задумалася, што яшчэ, — за гісторыю ўзялася. У мяне вялікі рэпертуар: толькі 65 твораў – залаты фонд. А найбольш дарагія мне «Беларусы. Поры года» — гэта вельмі цікавая праграма.

Танец перадае хваляванні сэрца, дакладней, хваляванні паўсотні сэрцаў — усіх артыстаў «Харошак», якія дораць са сцэны ўзрушальны аповед. Так сталася і на святочным канцэрце з нагоды 45-гадовага юбілею «Харошак» у Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

Колеравая і ідэйная насычанасць дэкарацый у Вялікім падкрэсліла дынаміку танцаў. І дзея ператваралася ў музыку рознакаляровых фарбаў. На юбілейным канцэрце ў Вялікім тэатры Валянціна Гаявая і «Харошкі» парадавалі гледачоў прэм'ерай «Купальская сюіта» ў трох частках на музыку У. Гінько і І. Ёрамяевіча. Гэты твор дэманструе пераасэнсаванне чалавечага жыцця: ад паганскіх часоў да прыняцця хрысціянства. Тут паказаны шлях душы ад жарсцяў да Усявышняга. Жаночае сола а капэла настройвала на надзею, дэкарацыі лесу — чаканне чагосьці таемнага. Адмысловае відэасуправаджэнне было ў тон рухам дзяўчын з вянкамі: як белыя птушкі надзеі ў карагодзе. «Ой рана на Івана» — дынаміка ў парах. Раптоўны звон — як напамін пра духоўнасць. Шматузроўневая кампазіцыя факусуецца на маленькім хлопчыку, які нясе фату. Незвычайная праніклівасць і глыбокі сэнс — такі падыход да працы калектыў назапашваў дзесяцігоддзямі.

Валянціна Гехт, загадчык трупы, у «Харошках» з часоў заснавання, танцавала ў адной з першых васьмі пар:

— Помню, як шукалі манеру выканання: было складана, бо новая мова, іншае выкананне, выпрацоўвалі індывідуальнасць. Мы першыя ўвялі ў сцэнічны касцюм галаўныя ўборы. З гастролямі пабывалі амаль паўсюль. Кантрастам запомніліся Індыя, Японія, Англія, Фінляндыя, Італія, Сірыя, Іарданія. Самая першая паездка была ў Данію і стала незвычайнай: паклоннікі не маглі пакінуць нас і нават праследавалі, суправаджалі з горада ў горад. Аб'ездзілі мы тады таксама ўсю Італію: за 40 дзён абагнулі ўвесь «бот».

Візітка «Харошак» — унікальная праграма «Полацкі сшытак», грандыёзная сваёй глыбінёй, бо сягае ў гісторыю. На сцэне паўстаюць розныя слаі грамадства ВКЛ: ад беднякоў да магнатаў. Запаленыя факелы на экране, сярэднявечная музыка — найлепшая атмасфера для балю ў дарагіх касцюмах на сцэне Вялікага (танец «Вечар у замку»). Пералівы тоненькага званочка — і пары ў няспешных рухах, прысядаючы, быццам ажываюць. Лірычная музыка падкрэслівае арыстакратычнасць. Мірскі замак на экране — ва ўнісон з танцам і вытанчанымі строямі. Але хутка іх зменіць прадстаўніца іншага слою грамадства, якая працягвае кошык, каб туды кінулі манетку. Пік праніклівасці — вакальнае сола траіх дзяўчын: «Панна Марыя, Маці, ты прыйшла з адным жаданнем — ратаваць людзей ад пакарання». «Полацкі сшытак» — праграма незвычайна маштабная, яна трымае гледачоў на адным дыханні ад пачатку і да канца. Вось, напрыклад, «Танец рамеснікаў» у яркіх рознакаляровых касцюмах, што зіхацяць як вясёлка. То наймацнейшая пульсацыя, то затуханне — цымбалы: іх сола з пералівам дае разгадку: і выходзяць пары, і ступаюць велічна ў касцюмах рамеснікаў. Такім чынам, кожны танец паказвае розных прадстаўнікоў грамадства, іх характар. І канцэптуальная нагрузка тут — менавіта на касцюмах.

Фота Багдана Жоўценя.

Харэаграфічная замалёўка «Пілігрымы» з праграмы «Полацкі сшытак».

— Усяго ў нас 7200 адзінак касцюмаў, — заўважае загадчык касцюмернай «Харошак» Ніна Сашко. — Я танцавала ў ансамблі у 80-я, у 1989-м пайшла на пенсію. Больш за ўсё мне падабаюцца народныя касцюмы: яны блізкія па духу.

А мастак па касцюмах Аляксей Гаявы адзначае:

— Касцюмы — свята для вачэй, для гледача, — у гэтым мая задача, прынамсі так я яе разумею. Ёсць касцюм, які мне асабліва дарагі, — у нумары «Мядуначка» з праграмы «Беларусы»: ён адзін з самых простых, але шчыры і чысты, як наша Беларусь.

Незвычайная красамоўнасць танца разам з узнёсласцю мелодый і вакальных партый даюць адчуванне палёту. Артысты «Харошак» глыбока сягаюць у існасць музыкі, увасабляюць рухі не аўтаматычна, а быццам адухаўляюць. Асабліва гэта адчувалася, калі пары пад дымінуэнда цымбалаў пакідалі сцэну. Найцікавейшы сюжэт — у нумары «Сакалінае паляванне». Сакалінае паляванне — любімая забава маладых князёў. Пасля палявання ў замку пачынаецца святочны вечар. Па старадаўнім звычаі юнакі ўпершыню ўбачаць сваіх з дзяцінства нарачоных нявест, закрытых фатой. У кожнай пары свая гісторыя... Калі вочы сустрэліся, а сэрцы з'ядналіся, то сыходзяць разам. «Полацкі сшытак» — прыклад меладычнага багацця, выразнасці і разнастайнасці. Трактоўка вобраза народа ўражвае яснасцю, відовішчнымі эфектамі, масавымі сцэнамі. Сляпы з палкай, які выстуквае рытм, акрабатычныя скокі беднякоў (замалёўка «Пілігрымы») — мелодыі ўзвышаныя, настройваюць на адкрыццё, даюць наймацнейшы зарад. Асабліва каларытнае сола баянаў.

Баяніст Мікалай Чарнамораў у калектыве ўжо 17 гадоў:

— Тут мая душа — гэта галоўнае. Калі справа падабаецца, то адпачываеш. Люблю і рухомыя, і лірычныя кампазіцыі. З лірыкі, напрыклад, — карагод з «Суботы»: хлопец і дзяўчына ў пары — пачуцці, каханне. Кожным разам ныраеш глыбей.

З'яўленне на сцэне манаха-гандляра індульгенцыямі, ролю якога выконвае заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь непаўторны Фёдар Балабайка, — як сонечная ўспышка. Фёдар Балабайка ў «Харошках» адзін з самых сталых удзельнікаў, працуе з моманту заснавання ансамбля:

— Сорак пяць гадоў у калектыве — гэта пра многае гаворыць, — заўважае Фёдар Якаўлевіч. — Сёння я асістэнт балетмайстра. Танцаваў. У «Харошкі» трапіў з самадзейнасці. Прайшоў конкурс — мяне ўзялі, і вось з 1974 года тут па сёння. Выдаеш свой адрэналін — і з гледачом узаемная аддача. Калі мы пачыналі, на той час у «Харошак» пераважала фальклорная праграма. Для мяне дарагія «Лянсей», «Весялуха», «Гусарыкі», «Субота», потым пайшлі іншыя нумары — «Местачковы вальс», «Пава», «Юр'еў конь», «Каляда». Мастацкі кіраўнік Валянціна Іванаўна — наш рухавік — лакаматыў, а мы — вагончыкі.

У харэаграфічнай замалёўцы з жыцця вандроўных жабракоў «Пілігрымы» аповед імкнецца да яркай кульмінацыі: бедняку з палкай надзяваюць на галаву карону. Каранаваны бядняк — дасягненне і недарэчнасць? «Полацкі сшытак» дае магчымасць задумацца пра многае…

Не менш насычаная беларуская сюіта ў трох частках «Субота»: у «Польцы з гармонікамі» эмоцыі здольны расквітнець надзвычай пышна. Сярод шматлікіх выяўленчых прыёмаў, якія дэманструюць чатыры пары, вылучаецца чачотка дзяўчат, феерверк народнай радасці. «Лірычны карагод» — як танцавальны эскіз для палётаў душы. У тым ліку дзякуючы вакалістам: «Няма майго міленькага, што я палюбіла…» Танец з музыкай і вакалам — паўната пачуццяў. Праніклівы завяршальны цымбальны пераліў — як абдымкі для душы.

«Скокі» — усплёск пачуццяў, экспрэсіі, калі мільгаюць чырвоныя сукенкі і белыя фартушкі. Неверагодна ўражальны танцавальны рух, калі хлопец круціць партнёршу як ваўчок: віртуознасць, запал, ураган пачуццяў.

— Феерверк эмоцый ад танца на сцэне дасягаецца напружанай працай, — пераканана Святлана Кашталапава-Патаповіч, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, педагог-рэпетытар «Харошак» (працуе з першага дня заснавання калектыву, танцавала сярод першых 8 пар, была вядучай салісткай). — Энергія прыходзіць, калі аддаеш, выкладаешся. Так і Гасподзь казаў: «Каб штосьці атрымаць, аддайце». Мышцы танцуюць разам з выканаўцамі, нават калі проста назіраю за імі. Без харэаграфіі немагчыма ўявіць жыццё. Калі згадваць першыя нумары, то гэта былі «Мітусь», «Кадрыля лянсей», «Столінская пастараль», «Пастушок», «Субота».

— Усё, на што здольны, усё, што маем, аддаём са сцэны, — дзеліцца Алеся Кур'ян, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь (у гэтым годзе 25 гадоў, як яна ў «Харошках»). — Я вельмі ўдзячна калектыву за тое, што ён даў: эмоцыі, перажыванні. Увесь прафесіяналізм мы зарабілі тут. Калектыў падарыў мне і сям'ю: тут я сустрэла мужа. Кожны нумар ты пражываеш, і кожны раз — абсалютна іншыя эмоцыі: ці то лірыка, ці то характарны энергічны нумар, дзе аддаеш тэхніку. Але ў любым выпадку на сцэну выходзіш наросхрыст.

Андрэй Асаёнак, цяпер рэпетытар «Харошак», прыйшоў у ансамбль у 1990 годзе. Валодае выдатнай тэхнікай, адметнымі акцёрскімі здольнасцямі. Усё жыццё адпрацавала ў «Харошках» артысткай балета і яго жонка Яна Асаёнак.

— Упершыню я трапіў на канцэрт «Харошак», калі яшчэ навучаўся ў вучылішчы (на той момант культпрасвет), — успамінае Андрэй Асаёнак. — «Харошкі» заўсёды ўражваюць тым, што з першых нот тут ствараецца абсалютна іншы свет. З тым, хто трапіў на спектакль «Харошак», здараецца нейкая метамарфоза, адбываецца своеасаблівае ачышчэнне (ад знешняга свету, дзе ўпор — на зарабленне грошай, а шоу — пад патрэбы гледача). Праграмы «Харошак» заўсёды адрознівала лірыка. Дзякуючы музыцы, харэаграфіі адмысловa закранаюцца струны душы з ніжняга рэгістра… Тут цябе чапляюць за самыя вытокавыя пачуцці, за базавыя адчуванні — любоў, пяшчоту, дабрыню. Пасля добрага спектакля, як і пасля добрага фільма, чалавек становіцца чысцейшы. Так якраз павінна быць, гэта нармальная з'ява. Калі я першы раз убачыў праграму «Харошак» (канец 1980-х гадоў), зразумеў, што буду танцаваць толькі тут.

Лекаў для душы сёння шмат, але, думаецца, танец — від лекаў адзін з найлепшых. «Харошкі» — доказ гэтаму.

Наталля СВЯТЛОВА

Фота Багдана Жоўценя.

«Шляхетны вясельны» танец з праграмы «Полацкі сшытак».

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

АСАЛОДА? БЕЗНАДЗЕЙНАСЦЬ?

На свеце існуе вялікае мноства падыходаў да чытання, за кошт якіх можна выцягнуць з кнігі нашмат больш інфармацыі, чым падчас класічнага паглыблення ў змест. Але не заўсёды веданне гэтых методык прыводзіць да нейкіх адкрыццяў.



Фота Кастуся Дробава.

Таму часам даводзіцца карыстацца імі папросту дзеля таго, каб атрымаць хоць нейкую асалоду ад чытання кніг, бо ёсць зборнікі з падзагалоўкам «Выбранае», ад якіх заўсёды ненаўмысна (але цалкам заканамерна) чакаюць пэўны зрэз аўтарскага творчага шляху: узлёты, падзенні, стылістычная эвалюцыя ці дэградацыя (ці ўсё разам), карацей, адмысловая дынаміка.

У анатацыі да адной з такіх кніг напісана, што ў ёй змешчаны вершы «ад пачатку да сёння» і «без ніякай храналогіі па часе напісання». Гэта быццам дае падставу да канцэптуалізацыі структуры кнігі, да ўпарадкавання мастацкага багажу некалькіх дзесяцігоддзяў. Нават сам па сабе працэс такога ўпарадкавання можа быць карысны — і ўжо не для чытача, а для самога аўтара. Але наступнымі словамі пасля тых, што працытаваны вышэй, ідуць гэтыя: «Падача па раздзелах досыць умоўная». Ды як жа гэтая кніга працуе на ўзроўні структуры? І ці працуе наогул?

Калі ацэньваць па крытэрыі «змены чытацкага вопыту» — так, безумоўна працуе. Але, на вялікі жаль, выключна ў негатыўным ключы. У кніге пяць раздзелаў, якія больш ці менш адпавядаюць наступным тэматычным блокам: прырода (пейзажная лірыка, якая ў асноўным завязана на канкрэтных порах года), радзіма (агульная — Беларусь і канкрэтная — Полацк), вайна і памяць (успаміны пра вайну, пераважна афганскую, пераплеценыя з успамінамі пра маці), а далей — досыць характэрная герантычна-псіхафізіялагічная «трылогія», якая складаецца з тэм болю/знішчэння, змагання з болем/знішчэннем, а таксама творчасці. Разбіццё на раздзелы павінна было прадэманстраваць тэматычную разнастайнасць, сканцэнтраваць увагу чытачоў на пэўных звышкропках аўтарскага мастацкага погляду, але замест усяго гэтага выявіліся дзве праблемы, фатальныя для ўспрымання як адной канкрэтнай кнігі, так і ўсёй творчасці аўтара.

Праблема № 1 (прыватная): аўтар часта паўтараецца. Тое, што магло б спрацаваць на ўзроўні асобнай падборкі для якога-небудзь літаратурнага часопіса, выглядае зусім па-іншаму, калі прачытваецца ў пяты ці дзясяты раз запар. Асабліва цяжка ў гэтым плане паддаюцца чытанню першыя два раздзелы: пра прыроду і радзіму. Вершы пра прыроду (з даўгімі туды-сюды-перакатамі паміж вясной, летам, восенню і зімой) спрабуюць сакцэнтаваць змест на розніцы паміж усімі порамі года, але з-за аднолькава элегічнага падыходу чытаюцца быццам сабраныя ў адзінае відэа *time-leap*, у якім за некалькі секунд могуць пранесціся дні, тыдні і нават гады. І вынік у такога прагляду адзін: агульнае пачуццё кліматычнай дынамікі, але ніякіх канкрэтных запамінальных вобразных стоп-кадраў. Яшчэ цяжэйшая сітуацыя — з тэкстамі пра родны кут. Пасля шматлікіх паўтораў слова «Беларусь» перастае ўспрымацца, а тэксты ў сваю чаргу быццам ператвараюцца ў карыкатурныя агіткі, партыю якіх падчас Года малой радзімы выпусціў з канвеера Мінскі вершавыпрацоўчы завод № 19. І гэта досыць сумна, бо, хаця асобныя вартыя моманты ў кнізе ёсць, яны змешваюцца са сваімі меней удалымі копіямі і зліваюцца ў аднароднае тэкставае месіва не самай высокай якасці. У рамках кнігі на гэтым можна было б паставіць кропку, але ж калі даводзіцца працаваць з Выбраным, можна перайсці і да агульнага творчага шляху паэта, а гэта заканамерна адгукаецца наступнай праблемай.

Праблема № 2 (глабальная): аўтар часта паўтараецца на працягу ўсяго творчага шляху. Тое, што магло б не надта сапсаваць аўтарскую карму ў выпадку з адной кніжкай, спрацоўвае наадварот у сітуацыі з Выбраным. Ад першай да апошняй літары кніга вытрымана ў адным стылі: роўна плывуць мова і мастацкія сродкі ад аднаго верша да другога, ад таго да трэцяга і г. д. Некалькі дзесяцігоддзяў працы са словам і назірання за светам прыводзяць да адных і тых жа матываў, адных і тых жа сродкаў выразнасці. І гэтаму ёсць частковае тлумачэнне: аўтар пачаў пісаць толькі ў 1990-х у сталым узросце. Лічыцца, што ў адрозненне ад прозы паэзія больш чуллівая да ўнутраных зменаў, да ўсіх мімалётных хістанняў душы. Таму добры паэт — той, хто праз усю шалёную сінусоіду быцця пранёс сваё слова з сабой. Паэзія — гэта актыўны працэс, працэс пошуку адказаў на пэўныя пытанні, а ва ўзросце, калі шмат адказаў ужо ёсць, застаецца толькі, як сумленнаму аптэкару, без канца ўзважваць-пераважваць назапашаныя траўкі і парашочкі, што пад прызмай паэзіі выглядае не так цікава, як можа выглядаць пад прызмай прозы.

Няма нічога надта таемнага ў тым, што гаворка ішла пра кнігу «Мір вашаму дому» паэткі Надзеі Салодкай, якая надрукавана ў выдавецтве «Чатыры чвэрці» гэтай восенню, але, зразумела, выведзеныя тэндэнцыі тычацца не толькі канкрэтнай паэткі, але і даволі шырокага пласта сучасных вершаскладальнікаў.

Даніл ЛЫСЕНКА

Цішыня перад выбухам

Што ёсць паэзія? Якія ў яе задачы? Ці павінна яна быць зразумелай чытачам. Адказы на гэтыя пытанні павінны дапамагчы з тым, каб, упершыню ўбачыўшы тэкст, з ходу зразумець: сапраўдная гэта паэзія? Аматары ўсялякіх эфемернасцяў кажуць, што гэта можна толькі адчуць. Прынамсі, другі пасля рыфмы і напісання ў слупок фактар, па якім мы з першага погляду вызначаем паэзію, — гэта моцная квяцістая вобразнасць.

Таму, сустракаючыся са структурай тэксту Вольгі Маркітантавай, чытач адразу аўтаматычна пазнае паэзію, нават калі не зважае на кароткую форму і напісанне ў слупок.

Кніга паэзіі «Паветраны акіян» (2018, «Медысонт») — выданне, для якога пазнакі «зборнік вершаў» увогуле недастаткова, бо яно на дзіва дакладна і канкрэтна выконвае формулу, адпаведна якой назва павінна абазначаць сутнасць усяго зместу. Іншымі словамі, у кнізе можна адзначыць тэматычную канцэптуальнасць. «Паветраны акіян» — гэта не назва аднаго з вершаў ці вобраз, які паўтараецца, — гэта сапраўдны матыў, матыў паяднання з прыродай і ў прыродзе. Тут жа неад'емна прысутнічае чалавек і чалавечая цялеснасць, якая пераплятаецца са стыхіямі, чалавек растваравецца ў паветры, прарастае дрэвамі.

Древние прозревали
Грудную клетку человека,
Клетку, в которой гнездится его жизнь.
Он поёт в бронхиальных ветвях...
... и вся она есть запрокинутое
Корнем к Богу
Древо жизни.

Праз гэтую «прыродную» накіраванасць, хаця яна і не мае нічога агульнага з пейзажнай лірыкай, вершы Вольгі Маркітантавай маглі б быць нечым медытатыўным. Яны ў чымсьці падобныя да сноў, але зусім не лёгкасцю, а нервовай вастрынёй абрысаў, яркасцю колеру, гіпертрафіраванасцю вобразаў, дзе не адыход ад рэальнасці, а цяжкае перажыванне яе.

Врастаю умом и сознанием
в этот весёлый дождь.
Фотография не вечна —
я запомню стук твоего зелёного сердца,
мой огромный Ботанический лес.

У анатацыі да кнігі Аляксей Арцёмаў адзначае: «Вершы Вольгі Маркітантавай, якія ўваходзяць у кнігу "Паветраны акіян", празрыстыя і чыстыя, але назваць бязважкімі іх нельга». Гэтая заўвага надзвычай слушная і шмат у чым дапамагае сфармуляваць стаўленне да тэкстаў. У пэўным сэнсе іх можна асацыяваць з японскім жанрам хоку, не ў апошнюю чаргу — дзякуючы форме. Гэта кароткія, рэдка калі большыя за восем радкоў, вершы без рыфмы. Але хочацца дапусціць асацыятыўнае ўдакладненне. Калі чытаеш хоку, пачынаеш адчуваць цішыню, і ўсё на свеце быццам становіцца на свае месцы. Тэксты з «Паветранага акіяну» — цішыня пасля выбуху або перад ім, бо іх эмацыянальная насычанасць афарбоўвае простае сузіранне ў быццам фантасмагарычныя колеры. Прыходзіць у галаву яшчэ адна японская асацыяцыя — анімацыйны рэжысёр Сатосі Кон і асабліва яго апошняя праца пад назвай «Папрыка». Хаця, паэтка ў адрозненне ад японскага рэжысёра для свайго насычанага метафарамі кіпучага свету выбірае натуральныя, а не гарадскія дэкарацыі.

Доктор с ключами
от моего сна
не выпадает
из реальности,
совпадает в движении
с лежащим телом.
Войдет в трамвай
поговорить с людьми,
обнимет тихие липы,
утонет в траве, подплывающей к горлу.

Вяртаючыся да слоў у анатацыі, можна паспрабаваць вылучыць прычыну такой паветранай цяжкасці. Падаецца, што, нягледзячы на шматслойную сцяну метафар, гэтыя тэксты вельмі рэалістычныя з пункту гледжання апісання пачуццяў і накіраваныя на тое, чым павінна займацца паэзія па некаторых меркаваннях: апісваць тое, для чаго чалавечая мова не прыдумала канкрэтных слоў. Вершы В. Маркітантавай нават унікальныя гэтай неверагоднай дакладнасцю фіксавання і апісання невыразных пачуццяў. Занадта моцна аб'яўляць іх зразумелымі і знаёмымі кожнаму, але, здаецца, чалавек, які сутыкаўся з такім эмацыянальным вопытам, пазнае яго і ў вершы.

Гэтыя адчувальныя, ледзь не прадметныя вобразы якраз і ствараюць пачуццё паветранай цяжкасці. Хаця час ад часу падаецца, што ў тэксце з'яўляецца наўмыснае філасофстваванне, вакол чагосьці ледзь заўважнага менавіта праз нагрувашчванне метафарычных пластоў узмацняецца эмацыянальнае напружанне. Па некаторых вершах можна прачытаць сутнасць творчага метаду аўтаркі.

Колосится горло поэта
В грозовой
опустелости,
Умственной духоте.
Больше вселенной,
его ненастный простор
втягивает, вбирает
мир на краю сознания,
березовое семечко на плече.

«Паветраны акіян» — дэбютная кніга, у яе ўвайшлі тэксты, напісаныя з 2012 па 2017 год. У сувязі з гэтым узнікае пытанне: ці наўмысна аўтарка пабудавала кнігу з такіх аднародных па форме і змесце тэкстаў, каб стварыць такі канцэпт, або гэтая аднароднасць проста ўласцівая аўтарскаму стылю В. Маркітантавай? Калі правільны варыянт другі, то цяжка ўявіць, як ёй удалося захоўваць такую стылістычную роўнасць на працягу пяці гадоў.

Так ці інакш, тэксты Вольгі Маркітантавай маюць сваё аблічча, сваю ўнутраную і вонкавую непаўторнасць. І разам з тым хочацца верыць у тое, што гэтая кніга — усё ж такі цішыня перад выбухам. Бо ад аўтара з такім метафарычным патэнцыялам хочацца чакаць таго, што зацятая, канцэнтраваная ў некалькіх радках вобразнасць і эмацыянальнасць разгорнецца ў нешта вялікае і моцнае.

Дар'я СМІРНОВА

Ад разгромных рэцэнзій да выдання кніг

Літаратурны талент у Алёны Занкавец прачнуўся рана: дзіцём яна складала вершы, першую аповесць напісала ў пятым класе, а раман — у дзявятым. Сёння, у 37 гадоў, на яе рахунку 8 мастацкіх кніг, супрацоўніцтва з выдавецтвамі «АСТ» і «Рэгістр». Да таго, як цалкам аддаць сябе літаратуры, Алёна таксама працавала са словам — была спецкарам «Знамя юности», шэф-рэдактарам «Вестника культуры», выпускала рэкламны часопіс. Сёння яна не толькі стварае захапляльныя сюжэты, але і дзеліцца сваім досведам на літаратурных курсах.

Фота з асабістага архіва Алёны Занкавец.

Нядаўна ў аўтаркі з'явілася нагода для радасці — пабачыў свет новы раман «Консультант па шчаслівым жыцці» («Консультант по счастливой жизни»), сродкі на які яна сабрала з дапамогай краўдфандынгавай інтэрнэт-платформы.

«Выхад кнігі — заўсёды асаблівая падзея, — дзеліцца Алёна Занкавец. — А яшчэ я зразумела: можна не чакаць, пакуль у выдавецтвах сыдуцца зоркі — і тваю кнігу надрукуюць. Трэба браць лёс у свае рукі».

Краўдфандынг — з'ява для Беларусі звыклая. Усе жадаючыя могуць добраахвотна падтрымаць намаганні іншых праз удзел у фінансаванні адмысловых праектаў праз інтэрнэт. І хоць для Алёны збор сродкаў скончыўся выданнем рамана накладам у тысячу асобнікаў, яна не хавае змешаных пачуццяў: «Я прыйшла на платформу *Ulej.by* якраз таму, што маёй дамове з адным расійскім выдавецтвам споўнілася два гады, а праект не рухаўся. Яшчэ дзве адабраныя праз конкурс кнігі ляжалі там жа. Чакаць урэшце надакучыла. На той момант на міжнародным літаратурным сайце ў мяне было больш за 2000 чытачоў, электронныя версіі раманаў куплялі і пыталіся, калі выйдзе папяровы варыянт. У той час я даведалася пра краўдфандынг і вырашыла паспрабаваць сабраць сродкі».

Першая рассылка, якая ахапіла дзесяць тысяч патэнцыйных спонсараў, не дала вынікаў, і Алёна атрымала горкі ўрок: складана зацікавіць людзей, якія не знаёмыя ні з аўтарам, ні з яго творчасцю.

«Нягледзячы на тое, што 20% сумы сабралася лёгка, я была ў разгубленасці, — успамінае аўтарка. — Як здабыць астатняе? Вырашыла ладзіць прэзентацыі яшчэ неіснуючай кнігі ва ўласнай бібліятэцы "Прастора даступных кніг", арганізоўваць розыгрышы, рэкламавацца ва ўсіх сацыяльных сетках. У выніку патрэбная сума назбіралася. Нават адна чытачка з Германіі перадала грошы праз знаёмых».

— Цудоўна, што з раманам усё атрымалася. А як вы ўспрымалі тое, што іншыя кнігі «завісалі» ў выдавецтвах?

— Гэта пакутлівае чаканне! Цяжка, калі ёсць ужо падпісаны дагавор, серыя для рамана, але праходзіць час — і нічога не адбываецца. Выданне кнігі — доўгі працэс, які, на жаль, можа скончыцца нічым. Старыя серыі закрываюцца, новыя не стартуюць.

Пасля таго, як адправіш у выдавецтва 3—4 рукапісы, разумееш, што не трэба чакаць. Пакуль рэдактар разглядае адзін тэкст, ты ўжо пішаш другі, а трэці адсылаеш на конкурс.

Першы раман я напісала ў 15 гадоў. Гэта была гісторыя кахання падлеткаў. Цяжкасці з'явіліся пазней, калі прыйшла пара рэдагаваць кнігу, а па сутнасці — перапісаць. Я грукала з гэтым тэкстам у дзверы розных устаноў — беларускіх, расійскіх, нават амерыканскіх — і была ўпэўненая, што маю працу хтосьці ды ацэніць. Але не ацанілі. Больш за тое, з «ЭКСМО» прыйшла такая негатыўная рэцэнзія, што я тыдзень не падыходзіла да камп'ютара. Але калі супакоілася, зноў пачала пісаць. З наступным раманам пашанцавала больш: ён выйшаў у «АСТ».

Што датычыцца «Кансультанта па шчаслівым жыцці», то мне было вельмі цікава зрабіць інтэрактыўную кнігу. Гераіня атрымлівае дзіўны падарунак: трохмесячныя кансультацыі па ўладкаванні жыцця. Пад назіраннем прывабнага спецыяліста дзяўчына шукае сваю формулу шчасця. А разам з ёй, па маёй задумцы, гэтым павінны заняцца і чытачы. Дзейсныя парады да гэтай гісторыі я карпатліва шукала па розных крыніцах, выпрабоўвала на сабе і нават мела стасункі з сапраўднымі кансультантамі па шчаслівым жыцці. Неверагодна, але такая прафесія сапраўды існуе.

— Супрацоўніцтва з літаратурнымі парталамі ў сеціве стала пэўнай школай?

— Калі пачынала пісаць кнігі, не было курсаў, дзе б гэтаму вучылі. Не было знаёмых у літаратурным асяроддзі, якія б давалі парады. Таму так, інтэрнэт стаў маёй школай. Вельмі жорсткай, але мудрай. Штодня я чытала блогі рэдактараў, глядзела стэнаграфіі разбораў раманаў, знаёмілася з тэкстамі іншых аўтараў. Спачатку самастойна шукала ў іх памылкі, потым звяралася з меркаваннем крытыкаў.

— Ці дапамагла журналісцкая практыка ў пісьменніцтве?

— Усе дзесяць гадоў у журналістыцы я спецыялізавалася на культуры і шоу-бізнесе. Дзякуючы гэтаму даведалася сотні гісторый, з якіх вывуджвала самае цікавае, шукала спосабы падачы матэрыялаў, адшліфоўвала выразы — і навучылася ператвараць усё гэта ў тэксты. І, тым не менш, адрозненне паміж публіцыстыкай і мастацкім словам каласальнае.

— Цяпер вы самі выкладаеце літаратурнае майстэрства. Як гэта атрымалася?

— Атрымала ад старшыні творчай суполкі прапанову вучыць пісьменнікаў-пачаткоўцаў. Гэта было адначасова і радасна, і страшна.

У мяне быў амаль дваццацігадовы досвед працы з тэкстамі, я прайшла шлях ад разгромных рэцэнзій да публікацыі ў «АСТ». Але і сумненні таксама былі: ці атрымаецца перадаць свае веды слухачам за 28 заняткаў? У выніку вучылася выкладаць на месцы: да тэорыі дадала творчыя заданні, імправізавала. А праз тры гады вырашала адкрыць свае ўласныя курсы. Хацелася стварыць больш кароткую і інтэнсіўную праграму, сустракацца з навучэнцамі не толькі на занятках, але і падтрымліваць іх у чаце.

А яшчэ, лічу, немагчыма стаць пісьменнікам без чытання. Сёння я сачу за навінкамі беларускіх калег. Каля сотні апавяданняў прачытала як член журы літаратурнага форуму «Славянская лира». А з любімых пісьменнікаў — Уладзімір Караткевіч, Іван Мележ, Джон Ірвінг, Донна Тарт, Сяргей Даўлатаў і Аляксей Іваноў.

— Вы пішаце па-руску, а як ставіцеся да беларускай літаратуры?

— Для мяне гэта не толькі творы на беларускай мове. Што тычыцца уласна беларускамоўных кніг, стаўлюся да іх як да любых іншых: ёсць выдатныя, ёсць нягеглыя. Хаця слабыя творы трапляюцца нашмат радзей. Лічу, беларускамоўная літаратура больш якасная.

Я пішу па-руску, таму што вырасла ў рускамоўным асяроддзі і думаю на гэтай мове. Пісьменніцтва — тонкая праца перадачы вобразаў. Каб пісаць на мове, трэба ведаць яе філігранна.

— Што зразумелі за доўгі час пісьменніцтва?

— Зразумела, што вучыцца пісаць трэба ўсё жыццё і не ўсё будзе атрымлівацца з першага разу. Пісьменніцтва — неверагодна складаны шлях, але больш дзівосны занятак уявіць цяжка. Я люблю свае кнігі, але ўвесь час здаецца, што мае лепшыя, разумнейшыя і глыбейшыя творы яшчэ наперадзе.

Гутарыў Павел САЛАЎЁЎ

Разнастайнасць талентаў

Літаратурна-мастацкі і гісторыка-краязнаўчы часопіс «Александръ» выдаецца ў Расіі з 2016 года. Сваю назву ён атрымаў, як няцяжка здагадацца, у гонар светача рускай літаратуры Аляксандра Пушкіна. Таму нездарма вокладку кожнага нумара ўпрыгожвае партрэтная выява класіка.

Выданне таксама адметнае тым, што выходзіць не ў Маскве і не ў Санкт-Пецярбургу, а ў правінцыі (Тамбоўская вобласць), пашыраючы тым самым геаграфію патэнцыйнай чытацкай аўдыторыі. Друкуюцца тут не толькі вядомыя пісьменнікі — часопіс на сваіх старонках ахвотна дае месца дэбютантам.

Сёлетні кастрычніцкі (37) нумар часопіса незвычайны. Ён пабачыў свет дзякуючы намаганням Сяргея Трахімёнка і Іны Фраловай. Сумесна з рэдкалегіяй яны падрыхтавалі спецыяльны выпуск, прымеркаваны да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Як адзначае ў прадмове галоўны рэдактар выдання Сяргей Труба, ён «адкрывае перад намі шматграннасць і разнастайнасць талентаў адметных людзей, што жывуць на прыўкраснай, дабрадатнай беларускай зямлі…».

Укладальнікі пастараліся як мага шырэй ахапіць жанрава-стылёвую размаітасць сучаснай беларускай літаратурнай і навукова-дакументальнай прасторы. Зацікаўлены чытач знойдзе тут літаратуразнаўчыя, гістарычныя нарысы, урыўкі з буйных празаічных твораў беларускіх пісьменнікаў, прысвечаных памятнай для беларусаў даце, і, вядома, пранікнёныя паэтычныя радкі.



Сярод аўтараў — Міхась Пазнякоў, Мікалай Чаргінец, Леанід Багдановіч, Наталля Саветная, Святлана Быкава, Мікола Шабовіч, Наталля Касцючэнка, Уладзімір Ашурка, Алена Стэльмах, Юрый Юлаў (Гарбачоў) і іншыя. Традыцыйна прадстаўлена і маладое пакаленне літаратараў — з вершамі выступаюць Валерыя Ісаковіч, Кацярына Страйлова, Анна (Ханна) Чумакова.

Паэтэса Валянціна Паліканіна ў адным са сваіх вершаў прызнаецца:

Хоть язык мой русский, сердцем —
белоруска.
[…….]
Здесь могилы предков, здесь ушла в строку я,
Бог мне дал в надежду родину такую.

Адметна, што выпуск знаёміць расійскага чытача са слыннымі постацямі беларускай культуры: напрыклад, літаратуразнаўчае эсэ Лідзіі Шагойка прысвечана жыццёваму і творчаму шляху Яна Скрыгана. Як вядома, гэты таленавіты беларускі пісьменнік, публіцыст і крытык на два дзясяцігоддзі аказаўся адарваным ад Радзімы: у страшныя 1930-я літаратар трапіў у жорны сталінскіх рэпрэсій і зазнаў пазбаўленне волі з высылкай у Сібір. Даследчыца распавядае пра перыпетыі лёсу беларускага творцы, пра нязломнасць духу і адданасць літаратарскай справе, якія дапамаглі Яну Скрыгану, а таксама іншым нашым пісьменнікам у тыя страшныя часы не толькі выжыць, захаваўшы сумленне, але і вярнуцца з пякельных кругоў, каб расказаць сучаснікам і нашчадкам усю праўду.

Не абмінуў сваёй увагай часопіс і імёны пачынальнікаў беларускай літаратуры. Нарыс Таццяны Ушылавай «Дзе адраджалася беларускае слова» прысвечаны Францішку Багушэвічу і музею-сядзібе «Кушляны». А ў матэрыяле Ірыны Мышкавец «Максім Багдановіч — выпускнік Яраслаўскай мужчынскай гімназіі» распавядаецца пра цікавыя старонкі з юнацтва класіка, якія нядаўна сталі вядомымі дзякуючы электронным копіям дакументаў з Цэнтральнага гістарычнага архіва Масквы — вучэбным справаздачам і атэстату сталасці будучага паэта.

Такім чынам, часопіс выконвае неабходную ў наш час функцыю — знаёміць расійскага чытача з даўняй і самабытнай культурай Беларусі. Безумоўна, у адным выданні адлюстраваць усю адметнасць зямлі пад белымі крыламі немагчыма, таму заўжды будуць запатрабаваны новыя выданні падобнага кшталту. Але пачатак пакладзены.

Янка ЛАЙКОЎ

Мікола АДАМ

***

Я ёсць. Я побач. Я з табою.
Мяне ты занатуй у снах,
Як верш, прынесены вясною,
Што ранкам заўтрашнім прапах.

Згатуй гарбаты, толькі чорнай
(Ёй даспадобы твой халат).
Праз лёсу моташныя жорны
Злаўлю пяшчотны твой пагляд.

Злаўлю цябе і супакою,
Як вецер — лісце ў шатах дрэў,
Каб ты вавёркай трапяткою
Даверыла свой дзіўны спеў.

Ты ёсць. Ты побач. Ты са мною.
Над намі — карагод планет,
Дзе шоўку даўкія судомы,
Адчуе толькі сам паэт.

***

Маланкі з неба брэшуць, як сабакі,
Палохаюць, судомамі вісяць.
І, быццам у псіхічную атаку,
Ідзе дажджу бязлітасны дэсант.

Залевы кроплі джаляць, нібы кулі.
Стыхія — рыхтык злосны акупант.
Вось-вось цябе палоніць ён. Гаргулій
Прыставіць, каб не ўздумала ўцякаць.

Не бойся, не хавайся пад падушку
І страху не дары свой дзіўны плач…
Я прашапчу тваё імя на вушка,
Вазьму на рукі. Ты мяне прабач,

Што не паспеў, не ўгледзеў, не падумаў…
Трымціш ля сэрца мокрым кацянём,
У шыю ціха дыхаеш фатумам,
Каб зразумеў, што толькі ты — мой дом.

***

Ты — як мой першы вечар з алкаголем,
Другая цыгарэта ранкам нашча…
Сэрца выбухае зорамі побач з табою
І шчанюком падскоквае ад шчасця.

Твая ўсмешка радуе ўсю планету,
Па якой, бы па расе, ты басанож прайшла.
І там, дзе ты ішла, фантанам кветак
Запладаносіла зямлі душа.

Ты з лёгкасцю пасунула і мае кнігі,
і маю работу
Адным-адзіным рухам свайго пляча
Ў белым малацэ сукенкі. Потым,
Потым усё. Найперш стасункаў чай,

Глінтвейн, абсент, віно, саке, марціні
Альбо гарачы й горкі шакалад.
Мне зносіць «дах», як спёкаю ў пустыні,
Калі не бачу твой уважлівы пагляд.

***

Там, дзе няма цябе, —
сонца не ўсміхаецца
І неба хмурыцца, быццам
пакрыўджаны бог.
Неба там да мяне спінаю павяртаецца
І не пускае, як ворага, на свой парог.

Не карагодзяць птушкі,
песні іх не спяваюцца.
І ванітуе ад кніг. Ім таксама баліць.
А да цябе прыйсці проста
не атрымаецца,
Нават каб прывітацца
і пачуць у адказ: «Прывіт».

Там, дзе цябе няма, —
снег, дажджы і маланкі,
Холад сабачы, што лезе сабакам у твар,
Цыгарэтных «бычкоў»
кілаграмы на стомленым ганку
І з безлічы вершаў самотных
горкі ўзвар.

А яшчэ адзінота на кожным кроку:
На яе натыкаешся, быццам
на сцены сляпы.
Там, дзе цябе няма, — гэта далёка,
І ні на адной мапе, як ні шукай,
не знайсці.

***

Як ты там? Дзе ты?
Я ж на тваёй планеце
Блукаю росамі, памяць п'ю літрамі,
Каб жыццё без цябе неяк вытрымаць.

Збіраю мэблю, праводжу праводку,
Дровы калю, каб ставалі кароткімі
Такія доўгія-доўгія будні,
Што ўсё адно падобны на ў акіяне
забытае судна.

Хаджу з кута ў кут, быццам
у пастарунку,
Згадваю ўяўныя, якіх нават
не было, пацалункі,
Памяць п'ю ўжо не літрамі, а скрынямі,
Напіваюся ёю, нібы сапраўднымі вінамі.

Як ты там? Дзе ты?
Я — на тваёй планеце.

***

Засынай, маё сонца, спі.
Хай прысняцца белыя росы.
Зранку твар імі ўмыеш ты,
Запляцеш, як стужкі, у косы.

Хай прысніцца казачны лес.
Ты хадзіць у той лес не бойся.
Ён табою прапах увесь.
Для яго ты таксама — сонца.

Феі, гномы, эльфы, звяры
Не крануць цябе ў гэтым лесе,
Бо яны ўсе — твае сябры,
Бо для іх ты, чуеш, прынцэса.

За цябе ў агонь і ў ваду —
Ваўкі, тыгры, ільвы, мядзведзі.
Усміхнуцца ім не забудзь,
Калі стрэнеш кагось з іх недзе.

Можа быць, і мяне прысні
Ў надвячоркавай прахалодзе
Лесу казачнае вясны…
Па таемных сцежках паходзім,

Зазірнём на каву да фей,
Пакаштуем вячэру ў эльфаў,
І пад кветак чароўны спеў
Нас накрые кахання шлейфам.

Засынай, маё сонца, спі.
Я цябе за руку патрымаю,
Пасяджу, пакуль ты засынаеш,
Каб ніколі не адпусціць.

***

Мы ў кавярні. Бярэцца на вечар.
Ты ў цэнтры
Сусвету, падзей і сонца.
І твой подых стае для мяне паветрам
І нават маім абаронцам.

Вакол гукі, як мухі, і ўсмешкі, як кветкі…
Ты — побач, ды быццам мара.
Я звычайна аматар памарыць нярэдка…
Але вось яна, ад мяне справа.

І здаюцца нямоцнымі ростані рукі,
Што ўсё ж нас з табой трымаюць,
Бо ўзяло і цябе і мяне на парукі
Пачуццё непазбежнага раю.

Я прыдумаю лёс. Ты яго раскадруеш.
Мы жыццё з табой разам здымем…
Мы ў кавярні. Бярэцца на вечар. Будзеш
Напой, нашым названы імем?..

Анхела ЭСПІНОСА РУІС

Пазбавіцца цярновага вянка...

***

Нават па вечнай зіме,
па нябачным маўчанні,
Я захаваю ўсе кветкі вясны для цябе.
Зоркі на небе нясуць успамін
аб каханні,
Нават па вечнай зіме,
па нябачным маўчанні.
Хай карабель застанецца заўсёды
ў блуканні,
Словы хай тонуць у морах,
у цьме й барацьбе:
Нават па вечнай зіме,
па нябачным маўчанні,
Я захаваю ўсе кветкі вясны для цябе.

***

Твае цені паўсюдна танцуюць,
квітнеюць чарэшняй,
Пранікаюць у кожны мой верш,
маё слова, мой сон,
І растуць палымянымі ўздыхамі
ветраў прадвесня
Каб з акна паляцець зноўку
ў вырай святым дзьмухаўцом.

Твае цені ўздымаюцца водарам
ружаў узімку,
Адгукаюцца рэхам бязгучным
чырвоных малін,
І лунаюць маўклівай журбою
над кожным абдымкам:
Твае цені малююць у сэрцы
твой голы ўспамін.

І за цені трымаюся я, нібы за павуціну,
Адчуваю штоноч пад падушкай
тваю цеплыню,
І гарэзлівых штучных магноліяў
спеў лебядзіны
Калыхае мяне пад нябеснаю коўдрай,
як сплю.

Твае цені, эфірныя цені, танцуюць,
лятаюць,
На руках адзіноты кідаюць і боль, і любоў,
І з ахвярніка чыстай Венеры
нектар выцякае,
Як цячэ з далягляду ракой мая
зорная кроў.

***

Падняцца б да неба заплюшчыўшы вочы,
Шукаць бы ўсляпую густы далягляд,
Па восеньскіх хмарах
паспешліва б крочыць,
Як крочыць суровым дажджом
лістапад,

Падняцца б над горадам вольным світаннем,
Між гнёздаў, што шэрань бязлітасна ўе,
Уніз паглядзець, затрымаць бы дыханне
І ведаць, што горад памрэ без цябе.

Падняцца б, каб зноў нарадзіцца
ў абдымках
Цяплом сваіх рук твае рукі б сагрэць
Палашчыць бы шчокі
крылатай сняжынкай,
Падняцца б вышэй... І ляцець, і ляцець!

Затанчыць бы танга з табой у палёце,
Забыцца б між зорак на страх вышыні
Згубіцца б з табой у туманнай пяшчоце
З зямлі хай кідаюць на нас камяні.

Па танцах з табою расплюшчыць
бы вочы,
На ростанях яркіх нябесных дарог...
Накрыцца б мне коўдрай заціхлае ночы,
Пакінуць бы сэрца табе каля ног.

Васіль КАЗАЧОК

Прысніў цябе…

Прысніў цябе, як яблыневы сад
П'яніў пахучай квеценню ля хаты.
І яблыняю ў квецені была ты,
Прывабная, як першы снегапад.

Гучаў гармонік на вясёлы лад.
Кружылі ў танцы хлопцы і дзяўчаты.
А я стаяў, нясмела-вінаваты,
І штось шаптаў, ды толькі неўпапад.

Мой сон мінуў — і воблачкам сплыла ты.
Расталі гукі музыкі ля хаты.
І толькі бацькаў састарэлы сад
Ля ганку цвіў, як шмат гадоў назад.

Асенні вернісаж

Восень-мастачка рукою чароўнаю
Піша і піша карціны-пейзажы…
Вогненна-яркія, жоўта-чырвоныя
Фарбы гараць на яе вернісажы.

Сонечным днём у пару цёплай восені
Ціша, лагода пануюць усюды.
Поле ўзарана і травы пакошаны —
Мілыя сэрцу карціны-эцюды!

Клён, нібы цар, апрануўшыся ў золата,
Велічна-горды стаіць каля тына.
Нібы спужаўшыся ранняга холаду,
Ягад агнём грэе рукі рабіна.

Двор дацвітае апошнімі кветкамі.
Птушкі не радуюць песняю шчырай.
З сумнымі крыкамі па-над палеткамі
Клін жураўліны шыбуе ў вырай.

Кроны бяроз загарэліся свечкамі.
Мяккім святлом залілі ўсё навокал.
Нізка схіліліся вербы над рэчкаю,
Яркаю вопраткай радуюць вока.

Восень! Твае залатыя пейзажы
Век бы глядзець мне і не наглядзецца!
Век бы наведваць твае вернісажы,
Каб хараством напаўнялася сэрца!

Фота Кастуся Дробава.

ІНФЕРНА

Апавяданне



Юры СТАНКЕВІЧ

Па-восеньску хутка сутонела. Дзверы ў кабінет рэдактара напаўпрыватнай, так званай жоўтай газеты, якая спецыялізавалася на рэкламе, крымінальнай хроніцы і іншых гарачых тэмах, адчыніліся. Зайшла загадчыца аддзела здарэнняў — стрыжаная пад хлопца цынічная і вострая на язык жанчына гадоў трыццаці.

Рэдактар, мажны, рана аблыселы, запрашальна ўзняў галаву.

— Я па справе і коратка, — сказала загадчыца аддзела. — Мне патрэбны супрацоўнік. Я не спраўляюся пасля таго, як наш калега і памочнік, як вы ведаеце, засіліўся.

— Не разумею такога, — праз паўзу скрушна адказаў рэдактар. — Дарэчы, чаму ён гэта зрабіў — так і не высветлілася?

— Ніхто нічога не ведае. І суіцыд, я лічу, дзікі. Каб яшчэ лязо і цёплая ванна — дык не, у сіло.

— Не судзі. Можа, у сям'і было дрэнна. А што ён рабіў у апошні час? Куды ты яго, запамятаваў, скіравала?

— Самога занесла. Нячыстая кватэра. Мяркую, палтэргейст. Ён наважыўся зрабіць адтуль нешта сенсацыйнае.

— Ну, тут, я маю на ўвазе кватэру, асабліва дзіўнага няма, — заўважыў рэдактар. — У вялікім горадзе, як наш, палтэргейст сустракаецца не так ужо і рэдка. Існуюць і «ціхія» яго варыянты. Але няхай. Шукай новага супрацоўніка. Я згодны.

— Ён за дзвярыма. Пакуль толькі кандыдат. Прадставіць?

Цырымоній пазбягалі, і рэдактар кіўнуў.

— Няхай зойдзе. А ты пагуляй. Нешта хутка ў цябе. І хто ён?

— Ён рэпарцёр. На радыё. Кажа — там нудна.

— Нудна? — здзіўлена перапытаў рэдактар. — Ну, а калі потым скажа, што ў нас — брудна? А ты яго правярала?

— Так. Нічога мутнага. А піша цікава. Хватка ёсць.

Высокі, шыракаплечы малады мужчына, спартыўнага выгляду, коратка стрыжаны, зайшоў у кабінет.

— Юльян Кайра, — стрымана прадставіўся ён. — Хачу ў вас працаваць.

«А вось жа і выбрала баба, — разглядаючы адкрыты, па-мужчынску гожы твар прэтэндэнта на месца, падумаў рэдактар. — У іх адно ў мазгах».

— Давай пра сябе, — сказаў ён. — Хто ты, адкуль, чаму да нас намыліўся? Я на «ты». У нас усё проста.

Раптам нечаканая думка прыйшла яму ў галаву.

— Дарэчы, тут ёсць адна кватэра, у якой адбываецца, калі не скончылася, нешта паранармальнае. Зрабі адтуль па гэтай тэме тэкст. Пабудзь там ноч, дамоўся з гаспадарамі, як здолееш, — сказаў ён. — І каб усё па часнаку. Праверым, калі трэба, на месцы ты ці не, патэлефануем уначы туды на хатні. І праз два содні раздрукоўка павінна ляжаць у мяне на стале. Усё зразумела? Паглядзім спачатку: які ты хваткі, ха-ха…

Рэпарцёр Юльян Кайра згодна кіўнуў.

— Ну, дык наперад. Усе падрабязнасці ў аддзеле.

Ужо зусім сцямнела, калі рэпарцёр Юльян Кайра па запісаным адрасе і навігатары дабраўся да прызначанага дома і зайшоў у патрэбны пад'езд. «Нячыстая» кватэра была на чацвёртым паверсе, але ён не стаў выклікаць ліфт.

Пасля трэцяга паверха ён заўважыў на лесвічнай пляцоўцы зусім маладую дзяўчыну, якая, седзячы на падаконні, пстрыкала смартфонам. Абое абмяняліся позіркамі. Дзяўчына была цёмнавалосая, з лялечным тварам, на якім выдзяляліся падмаляваныя чорныя бровы, а позірк падаўся яму пажадлівым і прыліпчывым.

Ён праверыў па лістку нумарацыю кватэры і, хвалюючыся, націснуў на кнопку званка.

— Вы да мяне? — раптам гучна спытала знізу дзяўчына і стала падымацца па прыступках.

— Мне трэба сюды, — паказаў на дзверы Юльян Кайра. — Пагаварыць з гаспадарамі і ўсё такое.

— А вы хто? — дзяўчына ўжо заступіла яму дарогу. — Я тут жыву, вас не выклікала. Матам з вамі можна, а то ходзяць усякія?

Гнуткая, са сцёгнамі, абцягнутымі джынсамі, яна, насуперак сваім словам, з гуллівым заклікам усміхнулася незнаёмцу нечакана рэдкімі, вострымі і белымі негроіднымі зубамі.

Рэпарцёр Юльян Кайра выцягнуў з кішэні пасведчанне, даў ёй паглядзець і, у думках адкінуўшы ўсялякія выкруткі, шчыра патлумачыў усё: пра заданне, якое можа вырашыць яго вакансію, пра ўмовы, што так брутальна выставіў яму садыст-рэдактар, і ў канцы сваёй споведзі пацікавіўся, ці дазволяць яму гаспадары кватэры крыху пасядзець у іх і паназіраць за тым, што такое адбываецца тут насамрэч, альбо, да лепшага, можа ўсё і так скончылася.

У сваю чаргу дзяўчына, якая назвала сябе Алінай, сказала: бадай, яму пашанцавала, бо ў кватэры, у якой усё далёка не скончылася, часам знаходзяцца яна і старэйшы брат, які б адразу прагнаў рэпарцёра. Каго тут раней толькі не было: прыходзілі міліцыянты, уфолагі, выклікалі святара, вядома, назалялі і журналюгі. Быў, дарэчы, і з вашай, быццам, газеты, але знік. Бацькі адразу з'ехалі на лецішча, а брат стаў запіваць, і гэта цягнецца ўжо два тыдні. А за кватэрай варта сачыць — ці мала што можа адбыцца. Яна сама баіцца там доўга знаходзіцца, таму і сядзіць, бывае, на падаконні лесвічнай пляцоўкі. І суседзі хвалююцца, не вітаюцца і не заходзяць — як азвярэлі, чмыры.

Нібы спраўджваючы яе словы, з дзвярэй суседняй кватэры высунулася жаночая галава, зыркнула на іх спалоханымі вачыма і схавалася назад.

У трохпакаёвай кватэры было як звычайна: гарэла святло, ледзь чутна працавала лядоўня, але неўзабаве выключылася на паўзу, і наступіла цішыня.

Было ў той цішыні толькі нешта напружанае і нагнётнае.

Аліне, магчыма, не было і сямнаццаці. Зблізу малапрыкметныя падлеткавыя прышчыкі на яе твары кідаліся ў вочы. Разняволена, з непрыхаваным выклікам даючы зразумець нечакана набытаму суразмоўцу, што ён ёй падабаецца, правяла яго па пакоях, пасадзіла ў крэсла і прапанавала гарбату.

Абое неяк быццам знайшлі агульную хвалю і спрабавалі размаўляць, прычым дзяўчына злоўжывала вульгарызмамі. Раз-пораз яна нервова прыслухоўвалася і азіралася на куты. Юльян Кайра, які раней паспеў пацікавіцца пра палтэргейст праз інтэрнэт, пачаў было гаварыць на гэтую тэму, але дзяўчына таго не пажадала, паведаміла толькі, што ў кватэры часам рухалася мэбля, у вітальні падала на падлогу, але чамусьці не разбівалася люстэрка, самі выкручваліся электракоркі з лічыльніка і шмат чаго іншага, пра што яна не хоча гаварыць. Дадала толькі на настойлівае пытанне суразмоўцы пра газетчыка, які прыходзіў раней: ён быў у кватэры з яе братам, але той узяў у яго грошы і пайшоў за гарэлкай, затрымаўся, вядома, і гадзіны дзве паляўнічы за сенсацыяй заставаўся ў кватэры адзін. За гэты час нешта здарылася, бо газетчыку на смартфон пачалі паступаць нейкія вар'яцкія эсэмэскі, а калі той адключыў мабільнік, на сцяне ў вітальні сам па сабе з'явіўся невядомага зместу надпіс, які яму давялося ліхаманкава сціраць. Што там было напісана, ніхто не ведае.

Раптам дзяўчына схамянулася. Зялёныя яе вочы бліснулі, як у коткі, у бок суразмоўцы.

— Хутка прыйдзе брат, — сказала яна. — І ён вас прагоніць. Толькі спачатку пашле па гарэлку.

— Што ж мне рабіць?

Яна паціснула плячыма.

— Я магу патэлефанаваць яму і давесці, каб не прыходзіў. Ён з задавальненнем застанецца ў сваёй даўняй сяброўкі, але ж, згадзіцеся, мне не зусім прыемна заставацца ноччу з незнаёмцам. Я ж вас, па сутнасці, зусім не ведаю. Хоць я б рызыкнула, ха-ха!

— Паслухайце, — праз паўзу нечакана прапанаваў Юльян Кайра, — я застануся тут, а вам дам ключы ад маёй здымнай кватэры, гэта амаль побач, выклічу таксі, і вы там спакойна адпачняце на канапе. А я выканаю заданне. Раніцай вы пакладзяце ключ пад дыванок ля ўвахода, альбо пакінеце ў суседзяў. Я пішу адрас?

— Даволі дзікая прапанова, — вымавіла дзяўчына.

— Згодны. Вось вам адрас і прагледзьце мой пашпарт, каб вы не западозрылі які лахатрон.

Дзяўчына завагалася.

— А вы дасцё мне пачытаць, што напішаце? — спытала ўрэшце яна. — Брат не давярае журналюгам. І не пабаіцеся застацца адзін? Я нават з братам тут баюся. Насланнё. За што гэта нам?

— Званіце брату.

Праз паўгадзіны рэпарцёр Юльян Кайра застаўся ў кватэры адзін. Ён перабраўся ў залу, пасунуў у самы кут крэсла і сеў у яго спінай да сцяны, вагаючыся, чым бы заняцца, каб неяк абстрагавацца, бо самая сапраўдная вусціш імкліва насоўвалася на яго. Ён хацеў было ўключыць тэлевізар, але чамусьці перадумаў і застаўся сядзець, прыслухоўваючыся да цішыні. Слабыя гукі з суседняй кватэры зверху яе амаль не парушалі. «Можа, тут даўно ўсё скончылася, а можа была ўвогуле якая сімуляцыя падзей, хто ведае...» — падумаў ён, разглядаючы столь з невялікай жырандоляй, аматарскую карціну ў драўлянай рамцы з выявай затокі і карабля на заднім плане, палічку з некалькімі кнігамі, павялічаны здымак Аліны ў купальніку ў нішы «сценкі», на якім яна была нішто сабе, стол, канапу, яшчэ розную нешматлікую мэблю і пашарпаны дыван карычневага колеру пад нагамі.

Час між тым ішоў, і нервовае напружанне расло. У пакоях і на кухні было паранейшаму ціха.

Але нечакана даволі гучная пстрычка сцебанула яму ў вушы, і Юльян Кайра, знерухомеўшы, убачыў, як фотаздымак Аліны вылецеў са сценкавай нішы, завіс у паветры на некалькі секунд, быццам яго нехта знарок трымаў, і павольна апусціўся на падлогу.

Прыступ раптоўнага страху абрынуўся на яго і прымусіў здранцвець. Думка пра тое, што ён свядома ўблытаўся ў нешта далёка не бяскрыўднае і варожае чалавеку, узнікла ў галаве, і з'явілася акрэсленае жаданне выбегчы з нячыстай кватэры, выпіць у якім начным бары гарэлкі і запамятаваць усё. Але ж Юльян Кайра быў занадта ўпартым і моцным на нервы, каб так ганебна здацца абставінам, і таму застаўся ў крэсле.

У кватэры зноў было ціха. Толькі праз нейкі час рыпнулі дзверы ў кухню і бразнулі пластыкавыя жалюзі ў суседнім пакоі. «Скразняк», — супакойваў ён сябе, але падсвядомасць падказвала, што гэта не так.

Тупа сядзець і далей паддавацца страху не выпадала, і Юльян Кайра выцягнуў з кішэні смартфон, уключыў навіны і паспрабаваў абстрагавацца. Ён пераскокваў з сайта на сайт, але ў голаў лезла зусім іншае: пра небяспеку паранармальнага, пра тое, што навука нахабна заплюшчвае на ўсё вочы, а людзі, якія цікавяцца гэтым, рызыкуюць сваёй рэпутацыяй. Ды толькі чытачам усё такое — у кайф.

Час ішоў, і гадзіннік паказваў ужо амаль сярэдзіну ночы, як раптам на кухні нешта гучна ляснулася і перасунулася на падлозе. Потым зноў стала ціха. «Можа, у суседзяў», — супакойваў сябе ён, разумеючы, што займаецца самападманам.

«Хіба варта ўключыць які фільм?» — прыйшла яму думка, і непаслухмянымі пальцамі ён знайшоў у смартфоне «Сем самураеў» Акіры Курасавы — сваю любімую мастацкую стужку.

Юльян Кайра ўключыў гучнасць на поўную і пачаў глядзець. Але раптам у яго з'явілася пачуццё, быццам з-за спіны нехта нябачны таксама глядзіць фільм, бо аднойчы ля вуха нібыта хтосьці задаволена пырхнуў, і зноў стала ціха. Стужка была амаль трохгадзінная, нескарочанага варыянту, і ён праз некаторы час выключыў яе — і акумулятар садзіўся, і — усё роўна ў голаў лезла адно жахлівае.

Нечакана святло згасла. Юльян Кайра сцяўся ў крэсле. Ён яшчэ ў дзяцінстве баяўся цемры, з гадамі гэтая фобія амаль што знікла, але зараз страх літаральна працяў.

Машынальна ён уключыў смартфон. Фільм на дысплеі працягваўся.

Святло запалілася.

Ля вуха зноў пырхнула. Індыкатар паказваў падзарадку акумулятара. Як гэта магло быць?

«Д'ябальшчына!» — пранеслася ў яго галаве. Ранейшае жаданне выбегчы з кватэры з новай сілай ціснула на свядомасць. Юльян Кайра зірнуў у праём акна і ўбачыў, што ўжо днела. Ён перажагнуўся непаслухмянай рукой, хоць і заўсёды лічыў сябе агностыкам.

Раптам у вітальні загрымеў званок тэлефона — ён уздрыгнуў і задам, каб не падстаўляць спіну, пасунуўся туды.

Тэлефанавала загадчыца аддзела. Яна была даўняя знаёмая Юльяна Кайры, і хоць іх знаёмства яшчэ не перарасло ў значна большае, ён здагадваўся, што нешта падобнае павінна адбыцца. Развадная — яна была ў пошуку — можа, таму і паспрыяла яму з месцам у газеце, дзе няблага зараблялі.

— Хай! — данеслася са слухаўкі. — Праверка майткаў, ха-ха. Жартую. Страшна?

— Жывы пакуль.

— Памятай, што праз дзень матэрыял павінен ляжаць у мяне на стале. Не падвядзі.

Рэпарцёр Юльян Кайра зноў пасунуўся да крэсла. На сцяне вітальні ён міжвольна адзначыў вачыма сляды зацёртага надпісу на тынкоўцы. «І што такога там магло быць напісана? — падумаў ён, — і кім, дарэчы, і навошта?» Але ж самае наймагутнейшае ў свеце тое, — раптам успомнілася яму, — што нельга ўбачыць, пачуць, спазнаць. І ці спазнаем калі-небудзь — вось што сумнеўна.

І быццам у пацвярджэнне гэтых думак ён праз нейкі час убачыў, сцяўшыся, як з палічкі насупраць вылецела шкляная ваза з алоўкамі і асадкамі, перакулілася (прычым усё тое змесціва дзіўным чынам не выпала адтуль) і, нібы дэманстратыўна, праплыўшы ў паветры, абрынулася на падлогу.

Больш ён чакаць не стаў, і праз хвіліну ўжо выбег з кватэры вонкі. Дзверы за ім зачыніліся. Развіднела.

Праз якія паўгадзіны, залпам выпіўшы ў бары шклянку гарэлкі, Юльян Кайра апынуўся на панылай, з рэдкімі мінакамі, вуліцы і скіраваў на сваю здымную кватэру. Яго нібы адпусціла, і цяпер нават гэтая сумнастэрыльная вуліца і пахмурныя твары мінакоў здаваліся яму блізкімі і роднымі.

У кватэры, на яго здзіўленне, пэўна, ужо нікога не было, бо ключ ляжаў пад дыванком. Юльян Кайра адчыніў дзверы і знерухомеў ад едкага паху гарэлых анучаў і пластыку. У адзіным яго пакойчыку здарыўся пажар. Абгарэлі фіранкі на вокнах, абрус на стале, коўдра на канапе. Усё ўжо было патушана, акно расчынена.

Якраз віскнуў яго смартфон, і Юльян Кайра прачытаў эсэмэску. Ад Аліны.

«Я ўсё растлумачу пры сустрэчы. Дасылаю свой пеленг і чакаю званка на згоду».

Яго зноў скаланула. Чортава дзеўка. Так, чортава! І як гэта ён раней не здагадаўся: чытаў жа ў сеціве пра палтэргейст. Тут розных тэорый — каля дваццаці. І выклікаюць яго часта фігуранты менавіта падлеткавага ўзросту, быццам пубертат прыцягвае да сябе і выяўляе тое нябачнае і незразумелае, якім застаецца яно дагэтуль, нягледзячы на ўсе намаганні даследчыкаў. Самазапаленне амаль заўсёды адбываецца на апошняй стадыі, як і зараз, бо менавіта гэтая дзяўчына неасэнсавана прыцягнула за сабой небяспеку.

І Юльян Кайра, не марудзячы, заблакаваў з ёй сотавую сувязь і, як спадзяваўся, назусім — разам з тым пагрозлівым і незразумелым, што ёй спадарожнічала і магло абярнуцца нечаканай бядой.

Юлія ДАШКЕВІЧ:

«У кожнага выдавецтва ёсць свая ніша, у якой хочацца развівацца»

Канец года — час, калі варта падводзіць вынікі і складаць планы. У вялікай ступені гэта датычыцца кнігавыдаўцоў, для якіх важна адзначыць, што ўдалося і на што трэба звярнуць увагу надалей. Пра тое, чым запомніўся 2019 год, распавядае намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» Юлія Дашкевіч.

Фота Кастуся Дробава.

— Колькі часу праходзіць ад задумы кнігі да яе рэалізацыі?

— Усё залежыць ад таго, у якім стане да нас трапіў рукапіс. Калі ён не патрабуе значных дапрацовак, то ўсё адбываецца вельмі хутка. Многае залежыць і ад мастацкага афармлення. Калі пісьменнік звяртаецца да нас і ўжо дамовіўся з мастаком, то працэс праходзіць больш гладка і займае літаральна месяц. Да таго ж вельмі важна, каб мастак стварыў пад аўтара, быў добра знаёмы з творам. Бо мастацкае афармленне — цалкам вынік работы аўтара і мастака. Калі ж мастака шукае выдавецтва, яму патрэбен час пазнаёміцца з творам, ды і над рукапісам даводзіцца папрацаваць, то на падрыхтоўку кнігі неабходна 3—4 месяцы. Таму, калі аўтар прыходзіць і кажа, што афармленнем будзе займацца канкрэтны мастак, выдавецтву нашмат прасцей. Ёсць варыянт, калі аўтар і ілюстратар — у адной асобе. Хоць гэта даволі рэдкая з'ява (напрыклад, Надзея Бука). Зараз мы запрашаем да супрацоўніцтва выпускнікоў Акадэміі мастацтваў, якія вельмі зацікаўлены ў ілюстрацыі кніг. Для іх гэта будзе першая праца. Але тут трэба знайсці аўтара, згоднага на такі эксперымент. Тым не менш, мне падаецца, гэта вельмі перспектыўная практыка, асабліва калі ідзе гаворка пра афармленне дзіцячай літаратуры.

— Што сабой уяўляе план Выдавецкага дома «Звязда»?

— Звычайна гэта каля 30 найменняў кніг у год з сярэднім накладам 1000—1500 экзэмпляраў кожная. Цесна супрацоўнічаем з бібліятэчнай сістэмай. У якасці прыкладу тут можна прывесці творы Кацярыны Хадасевіч-Лісавой, Міхаіла Дзеравянкі, Святланы Быкавай, Ірыны Карнаухавай, Анатоля Зэкава, Ягора Конева, кнігу якога, дарэчы, мы плануем выдаць і ў наступным годзе. Таксама выдаём за асабістыя сродкі тых аўтараў, кнігі якіх, па нашых прагнозах, не застануцца на складзе. Як правіла, гэта дзіцячая літаратура. Сёлета, напрыклад, выпусцілі дзве тысячы дадатковага тыражу кнігі «Ні секунды цішыні!» Дзмітрыя Юртаева.

— Асноўны чытач Выдавецкага дома «Звязда» — хто ён?

— У большасці сваёй гэта дзеці і падлеткі. Нават інфармацыя з бібліятэчных сетак кажа пра тое, што ў абанементах з'яўляецца ўсё больш падлеткаў. Што датычыцца людзей сярэдняга і сталага ўзросту, то для іх мы імкнёмся выдаваць ваенную літаратуру, асабліва важна гэта рабіць зараз — да 75-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, а таксама літаратуру, прысвечаную Году малой радзімы. Дарэчы, укладальніцай адной з адметных кніг на гэтую тэму — «Мая радзіма» — была Алена Стэльмах, а фотаздымкі для яе зрабілі Уладзіслаў Цыдзік і Яўген Пясецкі. Кніга цікавая тым, што тут прадставілі сваю малую радзіму ледзь не ўсе члены Саюза пісьменнікаў Беларусі.

— Ці ёсць нейкае адрозненне Выдавецкага дома «Звязда» ад іншых айчынных выдавецтваў?

— Наша выдавецтва робіць акцэнт на беларускамоўнай дзіцячай літаратуры. Хоць гэта і не прагаворваецца, у кожнага выдавецтва ёсць свая ніша, у якой хочацца развівацца.

Мы часта ўдзельнічаем у разнастайных міжнародных кніжных выстаўках, імкнёмся пераняць станоўчы вопыт іншых краін. Да таго ж, каб прывабіць чытача, пачалі дадаваць і *QR*-коды. Дзеці ўжо ведаюць, што можна паглядзець ролік (1 хв. 40 сек.), і гэтага дастаткова, каб яны сфакусіраваліся. Такія кнігі маюць сапраўдны поспех. Бясспрэчна, хочацца звязаць новаўвядзенні з кнігай. Напрыклад, у нас з'явілася кніга-квэст «Ключ ад вялікай каштоўнасці» Кацярыны Хадасевіч-Лісавай.

— І наклады, і тэматыка сведчаць пра зацікаўленасць чытача. Але як выдавецтва знаёміць з новымі кнігамі?

— Выдаць кнігу — адна справа. Зусім іншая — яе прадаць, данесці да чытача. Перш-наперш у гэтым дапамагаюць бібліятэкі. Але яны ўвесь тыраж выкупіць не могуць. Таму на базе крам «Белкнігі» і «Белсаюздруку» праводзім штотыднёвыя прэзентацыі. Так, мы замацавалі за сабой апорныя крамы — № 13 «Белсаюздруку» і «Кнігаполіс» ААТ «Белкніга» Мінска, а таксама «Букініст» у Магілёве. У «Кнігаполісе» праводзім акцыю «Чытаем разам са "Звяздой"». Там, дарэчы, размешчаны асобны стэнд, прысвечаны нашай літаратуры, — можна знайсці любую кнігу Выдавецкага дома, да таго ж набыць іх са зніжкамі. Зараз запусцілі акцыю «Новы год са "Звяздой"»: пры набыцці любой нашай кнігі да 31 снежня 2019 года пакупнік атрымлівае падарунак: паштоўку-ліст да Дзеда Мароза. Акцыя дзейнічае ў Цэнтральнай краме, «Кнігаполісе» і ва ўсім «Белсаюздруку».

Яшчэ адна з нашых акцый — «"Звязда" сустракаецца з сябрамі» — праходзіць з лістапада 2019 г. у горадзе Магілёве і ўсіх буйных гарадах Магілёўскай вобласці. Такі маршрут абраны таму, што вынікі акцыі будуць падведзены на Дні беларускага пісьменства ў Бялынічах. Пасля таго, як Бялынічы перададуць эстафету іншаму гораду, мы завітаем і туды. Такім чынам плануем аб'ездзіць усю Беларусь. Але самае галоўнае — трапіць у тыя месцы, куды шмат новых кніг наўпрост не даходзіць, чытач іх не бачыць. Калі мы куды-небудзь выязджаем, то запрашаем з сабой аўтараў, якія праводзяць прэзентацыі на базе бібліятэк і школ: часта гэта дзіцячыя конкурсы, загадкі, вершы, пераўвасабленні і традыцыйна ў канцы кожнага мерапрыемства — продаж і аўтограф-сесія аўтара.

— З якой рэакцыяй часцей сутыкаецеся?

— Звычайна і дзецям, і бацькам усё падабаецца. Трэба адзначыць, у параўнанні з 2016—2017 гадамі, павялічыліся і пакупніцкі попыт, і бібліятэчны фонд. Асабліва заўважная цікавасць дзяцей малодшага школьнага ўзросту да беларускамоўных кніг. Усё ж друкаваная кніга вяртаецца.

— Літарататурная крытыка дапамагае, перашкаджае? Ці адчуваецца ўвогуле яе ўплыў?

— Безумоўна, так. Але і станоўчую, і адмоўную крытыку ўспрымаем добра. У сённяшнюю эпоху інтэрнэту вельмі цікава сачыць за дыялогам, які так ці інакш узнікае пры любым абмеркаванні твора. І гэта насамрэч выдатна: пра кнігі чуюць, ведаюць.

— Якім аўтарам даводзіцца адмаўляць?

— Кожны пісьменнік лічыць свае творы найлепшымі. Але ўсё вырашае рэдакцыйны савет. Пры абмеркаванні ўлічваецца перш за ўсё тэма, якая можа быць не зусім цікавая сённяшняму чытачу. Час ад часу прапаноўваем удасканаліць твор: папрацаваць з архівамі, пашукаць фотаздымкі і г. д. Бывае і такое, што нелагічна нейкі твор выдаваць асобнай кнігай — гэта хутчэй нагода для таго ці іншага зборніка, у які б увайшлі розныя аўтары. Часам, калі твор не дацягвае да фармату асобнай кнігі, раім аўтарам звярнуцца ў нашу перыёдыку — «Нёман» ці «Полымя», напрыклад. Але здараецца і такое, што ў аўтара атрымліваецца пераканаць нас у неабходнасці яго кнігі, і мы мяняем сваё меркаванне. Стараемся знайсці залатую сярэдзіну і нікога не пакрыўдзіць.

— Што б параілі пісьменніку, які ўпершыню хоча выдаць кнігу?

— Кніга павінна быць цікавая, запатрабаваная чытачамі. Неабходна, каб аўтар ведаў, якая ў яго аўдыторыя, хто яго чытач. Хочацца, каб выданне не стаяла на паліцы. Што датычыцца звароту да канкрэтных жанраў, то тут складана сказаць. Напрыклад, апошнім часам мы выдалі некалькі гістарычных раманаў, якія мелі поспех, таму плануем працягваць выданне такой літаратуры. Але гэта не азначае, што аддамо перавагу толькі ёй.

— Якія кнігі вашага выдавецтва чакаць чытачам у наступным годзе?

— Па-першае, будзе працяг серыі кніг Людмілы Рублеўскай — 6 кніга — «Авантуры Вырвіча, лётніка і чорнай меланхоліі». Дзецям, спадзяёмся, будуць цікавыя новыя кнігі Ірыны Карнаухавай, Ірыны Токаравай, Жанны Міус, Кацярыны Хадасевіч-Лісавой. Яшчэ ў нас рыхтуецца кніга «Без жалезнай заслоны» знакамітай журналісткі Інесы Плескачэўскай, з якой мы ўжо супрацоўнічалі пры выданні кнігі пра Францыска Скарыну. Працягнем серыю «У пошуках страчанага» Уладзіміра Ліхадзедава: гэтым разам пра Нясвіж.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Калаж Кастуся Дробава.

«Ля вытокаў нашых імёнаў»

У апошнія гады актыўна вывучаецца анамастыкон беларускай мастацкай літаратуры (працы А. Рогалева, В. Рагаўцова, А. Гіруцкага, С. Бут-Гусаіма, Г. Басавай і інш.). У асобных дысертацыйных даследаваннях комплексна разгледжаны анамастыкон мастацкіх твораў Я. Коласа, Я. Купалы, У. Караткевіча, І. Мележа, І. Навуменкі, І. Шамякіна, В. Казько, У. Верамейчыка.

У 2018 годзе пабачыла свет грунтоўнае выданне Васіля Шура — «Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапанімія і тапанімія» (Мазыр, «Выснова»), у якой акумуляваны частковы вопыт аўтара з папярэдніх манаграфій і дапаможнікаў. Вядомы лінгвіст, доктар філалагічных навук, прафесар Шур амаль 50 гадоў сваёй плённай дзейнасці аддаў даследаванню анамастычных адзінак у соцыуме і ў творах мастацкай літаратуры. Даследаванню анамастычнай лексікі беларускай мовы, асаблівасцям функцыянавання гэтых моўных адзінак у грамадстве і ў тэкстах мастацкіх твораў беларускіх пісьменнікаў прысвечаны многія яго манаграфіі («З гісторыі ўласных імёнаў», «Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапаніміка і тапаніміка», «Анамастычная лексіка ў беларускай мастацкай літаратуры» і інш.), якія станоўча характарызавалі як вядомыя вучоныя-мовазнаўцы, так і пісьменнікі і педагогі-практыкі.

Выданне «Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапанімія і тапанімія» складаецца з трох раздзелаў, назвы якіх гавораць самі за сябе: «*Ля вытокаў нашых імёнаў*», «*З гісторыі беларускіх прозвішчаў*», «*З гісторыі беларускіх тапонімаў*». У першым апавядаецца пра гісторыю ўласных імёнаў, пачынаючы яшчэ з часоў язычніцтва і да нашых дзён. Тэарэтычны матэрыял багата ілюстраваны прыкладамі, якія падкрэсліваюць унікальнасць і самабытнасць нацыянальнага іменніка. Яны падмацаваны статыстычнымі данымі, якія адлюстроўваюць ужывальнасць і частотнасць уласных імёнаў на пэўным гістарычным адрэзку часу ці ў канкрэтнай мясцовасці. Засяроджваецца ўвага на існаванні варыянтнасці ва ўжыванні ўласных імёнаў з розных рэгіёнаў Беларусі, што стала вынікам узаемадзеяння рэлігійных ідэалогій (каталіцкай, праваслаўнай, язычніцкай), фанетычным і марфалагічным зменам разнастайных паводле паходжання імёнаў (старажытнаяўрэйскія, скіфскія, грэчаскія, рымскія, скандынаўскія), уплывам грамадска-палітычных фактараў, асабліва ў савецкі перыяд.

Другі раздзел прысвечаны аналізу паходжання і працэсаў фарміравання нашых нацыянальна адметных прозвішчаў, спосабаў і мадэляў утварэння, іх лексічнага складу, межаў бытавання, асаблівасцей узаемаўплыву беларускіх і замежных прозвішчаў. Аўтар тактоўна папраўляе некаторых даследчыкаў, якія не звярталі ўвагі на пэўныя бясспрэчныя факты мясцовай анамастыкі, а ў якасці аргументаў прыводзілі прыклады з моў і краін, далёкіх ад Беларусі (напрыклад, тлумачэнне некаторых айконімаў фактамі з іншых моў і ігнараванне такіх фактаў з беларускіх летапісаў і гаворак у працах В. Жучкевіча і інш.). Грунтоўна разгледжана і сістэма мянушак, ад якіх утворана вялікая колькасць сучасных прозвішчаў, а гэта прыкладна 40 %. Не абыходзіць увагаю аўтар гісторыю ўтварэння і паходжання псеўданімаў, іх разнавіднасці: фіктонімы (*Міхась Чарот* — М. Кудзелька), абагульняльныя псеўданімы (*Мікалаевец* — К. Міцкевіч), крыптонімы (*Б-віч* — М. Багдановіч), псеўдаандронімы (*Гаўрыла з Полацка* — А. Пашкевіч), псеўдагінімы (*Ганна Аршыца* — У. Дубоўка), псеўданімы-анаграмы (*Чабола* — А. Лобач), псеўданімы-палінонімы (*А. Колб* — А. Блок), раскрываючы некаторыя «таямніцы» іх узнікнення.

Значнае месца адводзіцца разгляду імёнаў, прозвішчаў, мянушак у літаратуры на прыкладах з твораў выдатных майстроў мастацкага слова. З шэрагу онімаў персанажаў аўтар вылучае гаваркія імёны. Так, асобна аналізуюцца і сістэматызуюцца мянушкі ў творчасці Я. Коласа. Гэта каля трох дзясяткаў мянушак (*Хрушч, Акула, Чарнамор, Кашчэй, Балоцімус, Балаховец, Латак, Струк, Судзьба, Абрыцкі-Тэш, Рачок* і інш.), якія класіфікуюцца аўтарам у семантычныя групы, зыходзячы з тых спецыфічных дэталяў (род заняткаў, знешнасць, унутраныя якасці і інш.), пры дапамозе якіх пісьменнік выдзяляе сваіх герояў.

Асобная частка раздзела прысвечана аналізу анамастычнай прасторы класічнага твора 30-х гадоў XX ст. — аповесці Я. Коласа «Дрыгва», у якой онімы выступаюць сродкамі мастацкай тыпізацыі і стварэння рэгіянальнага і нацыянальнага каларыту. У тэксце выкарыстоўваецца больш за 130 онімаў. Асаблівасць твора — наяўнасць рэальных прататыпаў персанажаў аповесці, сярод якіх цэнтральнае месца займае вобраз легендарнага палескага партызана *дзеда Талаша*. Не менш багаты твор і на тапанімічныя адзінкі, прычым побач з рэальнымі назвамі, якія акрэсліваюць месца дзеяння ў творы (*Палессе, Мазыр, Петрыкаў, Прыпяць*), шырока ўжываюцца тапонімы, створаныя творчай фантазіяй Я. Коласа альбо «запазычаныя», перанесеныя з іншых рэгіёнаў і часткова зменены.

У трэцім раздзеле разглядаецца ўтварэнне, этымалогія і функцыянальнае ўжыванне тапонімаў на розных гістарычных этапах. Аўтар грунтоўна падышоў да падачы гіпотэз паходжання некаторых айконімаў: часам разглядаюцца адразу некалькі этымалагічных версій, прыводзяцца народныя тлумачэнні (легенды, паданні), меркаванні аўтарытэтных навукоўцаў і ўласныя погляды (*айконімы Масква, Мазыр, Тураў, Гомель, Магілёў, Лагойск, Мінск* і інш.). Засяроджваецца ўвага на ўзаемадзеянні беларускай анамастычнай сістэмы з лексікай іншых этнасаў (мазуры, яцвягі, балты, прусы, татары і інш.), што таксама адлюстравалася ў тапаніміцы. Аналіз дае ўяўленне аб працэсе засялення тэрыторыі сучаснай Беларусі, прыродна-геаграфічных умовах, сацыяльна-эканамічных стасунках з іншымі народамі.

Арамя гэтага, у змест кнігі ўваходзяць «*Кароткі слоўнік анамастычных тэрмінаў*», а таксама «*Спіс найбольш вядомых беларускіх імёнаў (іх варыянты, паходжанне, значэнне)*», арыгінальнасць якога бачыцца ў падачы аўтарам афіцыйных імёнаў паралельна з іх народнымі варыянтамі: **Аляксандр** (*разм.* Алесь, Аляхно, Лесік, Сан, Санюк, Саша, Шура, Аля, Лёкса і інш.; ***грэч.*** — абараняць і муж, мужчына) — мужны, абаронца.

Вучэбны дапаможнік адрасаваны магістрантам. Аднак навукова-папулярны характар гэтай кнігі, удалае спалучэнне энцыклапедычных звестак з выверанымі займальнымі фактамі значна пашырае кола яе чытачоў. Нельга не адзначыць і вялікі выхаваўчы патэнцыял дапаможніка, які, безумоўна, будзе карысны ўсім, хто не толькі цікавіцца беларускай анамастыкай, але і імкнецца пашырыць свае веды ў галіне гісторыі, культуры Беларусі, хто неабыякавы да сваёй малой радзімы і заклапочаны захаваннем нацыянальных традыцый і культурных набыткаў, як і аўтар гэтай кнігі.

Вольга СЛІВЕЦ

Фота Кастуся Дробава.

ПАСПРАБАВАЦЬ НА СМАК... МОВУ

Уладзімір Караткевіч назваў мову «гнуткім, спявучым, адвечна новым інструментам». У такім разе майстрам слова варта гэтым інструментам карыстацца ўмела, каб, з аднаго боку, атрымаўся добры вынік — годны твор і, з другога — не сапсаваць такую тонкую прыладу.

Сёння звернемся да ўжывання дзеясловаў *пакаштаваць, паспытаць* і *паспрабаваць* і прасочым, як яны функцыянуюць у тэкстах.

Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы (2016) падае значэнне дзеясловаў *пакаштаваць* як ‘паспрабаваць на смак ежу, піво’ і паспытаць як ‘пакаштаваць, паспрабаваць на смак’, то бок ‘спроба’ і ‘смак’ утрымліваюцца ў семантыцы слоў: «***Пакаштуй,*** *— кажа бацька. — Гэтыя бульбінкі можна есці нават сырыя...*» (Уладзімір Дубоўка); *...Таргуюцца з дзядзькам, гуркі* ***паспытаўшы****, манументальныя капітаншы* (Рыгор Барадулін). Зразумелыя і празрыстыя паводле сэнсу выказванні не патрабуюць нейкіх дадатковых тлумачэнняў.

З гэтай прычыны варта было правесці рэдактарскі аналіз і праўку наступных сказаў, у якіх слова смак якраз і з’яўляецца збыткоўным: *Пакаштавалі ~~смак капыльскіх сыроў~~* (праўка: *капыльскія сыры*); *Бяспеку прадуктаў ацанілі па прадстаўленых табліцах, а вось сыры з задавальненнем паспыталі на ~~смак;~~ На галіну села нейкая ружова-шэрая птушка і распачала знаёмства з яблынькай — паспытала ~~на смак~~ яблычкі.*

Дзеяслоў *паспрабаваць* у некалькі разоў больш частотны праз полісемантычнасць і функцыянуе пераважна з інфінітывам: «*Няхай ён раней* ***паспрабуе даказаць,*** *што гэта няпраўда*» (Кандрат Крапіва); «*Пэўна, генерал нейкі або герой*», — ***паспрабаваў адказаць*** *Грышка* (Уладзімір Гніламёдаў). Выраз жа ‘паспрабаваць на смак’ уяўляецца грувасткім, неэканомным, набліжаным да іншамоўнага светаадчування, і лепш выкарыстоўваць два вышэйпамянёныя дзеясловы: *Яна* [рыба-малпа] *паступова асвойваецца на новым месцы і ўжо нават ~~паспрабавала на смак~~* [пакаштавала] *беларускі корм; Кожнаму прысутнаму было прапанавана ацаніць знешні выгляд страў, ~~паспрабаваць~~* [паспытаць] *іх ~~на смак,~~ а затым зрабіць выбар.*

Шмат хто з чытачоў, мяркуем, знаёмы з лозунгам на білбордах «Смак беларускай мовы». Дарэчна падабраныя назвы ягад суадносяцца менавіта са смакам і праз метанімічны перанос паказваюць мілагучнасць і арыгінальнасць родных слоў. Сёння адбываецца пашырэнне падобнага словаўжывання і з выкарыстаннем дзеясловаў. Напрыклад, у сказе *Задумка вытворцаў — стварыць прадукт, пакаштаваўшы які, турыст у літаральным сэнсе адчуе Беларусь на смак* «смак Беларусі» пераносіцца на прадукт, выраблены ў нас, думка аўтара зразумелая, але ўсё ж трэба выкарыстаць дзеепрыслоўе *паспрабаваўшы*, бо нельга пазбавіцца ад назоўніка смак, не парушыўшы сэнсавага напаўнення сказа. (Засмучае таксама пашыранае ў тэкстах няправільнае пунктуацыйнае афармленне: злучальнае слова — залежны кампанент дзеепрыслоўя, таму пасля які коска не ставіцца.) Аўтар сказа ***«Пакаштаваўшы» смак*** *высокіх ураджаяў, калі на круг выходзіла па 60, а то і па 75 цэнтнераў, сёлетнія 48,3 ц/га здаюцца не вельмі добрым рэзультатам* імкнецца праз двукоссе перадаць няслоўнікавае значэнне, але гэта не ліквідуе семантычнай збыткоўнасці, таму зноў пажадана абраць *паспрабаваўшы* (ды і назоўнік *рэзультатам* замяніць на *вынікам*). А ў сказе *Потым кожны паспрабаваў стварыць свой уласны тэкст і прэзентаваць яго, можна было сапраўды «паспытаць на смак» жывую нямецкую мову* канструкцыю *‘паспрабаваў стварыць’* можна замяніць ‘рызыкнуў стварыць’, а другую — на ‘паспрабаваць на смак’. Параўнаем сказ з прымальнай перадачай думкі: *Тэатральны «кактэйль» пад такой назвай* ***паспрабавалі на смак*** *гледачы ў раённым Доме культуры ў мінулую пятніцу.*

«Смак беларускай мовы» будзе насамрэч адмысловы, прывабны і незабыўны толькі з дакладнымі і дарэчнымі «інгрэдыентамі».

Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ

Алхімік і віртуоз эскізаў

Чым унікальная творчасць Шрагі Царфіна, альбо Як мастак са Смілавіч стаў легендай Манпарнаса?

Ён ствараў эскізы для Како Шанэль, стаў адной з легенд Манпарнаса. Знакаміты мастак Шрага Царфін нарадзіўся ў Смілавічах, у тых самых, адкуль родам Хаім Суцін, Станіслаў Манюшка. Да канца сваіх дзён мастак не забываў (па яго ўласных успамінах) светлы рай свайго дзяцінства: лес, рэчку Волму, гарбарную майстэрню бацькі. Ён спяваў песні на беларускай мове. Хоць Беларусь не стала яго пастаянным месцам жыхарства, але назаўжды засталася ў сэрцы. Зараз у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі адкрыта першая і, безумоўна, унікальная для нашай краіны выстаўка Шрагі Царфіна «Рух да святла», прымеркаваная да 120-годдзя мастака.

ФАРМАТ І КАНЦЭПЦЫЯ

На выстаўцы прадстаўлена 52 работы з калекцыі групы кампаній «А-100», Нацыянальнага мастацкага музея, Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі пасёлка Смілавічы і прыватных калекцый. Многія работы дэманструюцца ўпершыню. Хіты экспазіцыі — 15 твораў 1940—1970 гадоў. Гэтым вернісажам Мінск апярэдзіў Парыж. У сталіцы Францыі 120-годдзе Шрагі Царфіна адзначаць толькі ў наступным годзе.

— Унікальнасць выстаўкі ў тым, што тут прадстаўлены работы адразу васьмі калекцыянераў. Пасля экспазіцыі яны зноў разыдуцца па прыватных калекцыях і іх нельга будзе ўбачыць, — адзначыла на адкрыцці праекта вядучы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Надзея Усава. — Бо людзі могуць іх прадаць, а новыя гаспадары выстаўляць не захочуць. Гэта ўнікальна, што 52 работы аказаліся ў адным месцы. Карціны Шрагі Царфіна маюць моцнае эмацыянальнае ўздзеянне, людзі ледзь не губляюць прытомнасць перад яго работамі. Такія выпадкі неаднойчы бывалі ў свеце. Раней госці часта пыталі ў нас: «Калі, нарэшце, адкрыецца Царфін?» Мастак прыцягвае ўвагу, хоць яшчэ ў 2012 годзе яго мала хто ведаў. Выдатна, што за 7 гадоў у вывучэнні намі біяграфіі творцы адбыўся такі велізарны скачок.

Ідэя стварэння экспазіцыі належала Паўлу Латушку, дырэктару Купалаўскага тэатра, які быў паслом Беларусі ў Францыі. Менавіта дзякуючы яго садзейнічанню ўдалося сабраць карціны для экспазіцыі. Бо іх уладальнікі не гарэлі жаданнем прадаваць работы Царфіна. Перамовы занялі восем месяцаў і ўвянчаліся поспехам толькі пасля таго, як былым уладальнікам карцін паабяцалі, што творы будуць выстаўлены на радзіме мастака.

З СЯМЕЙНАГА АРХІВА

У дзень адкрыцця фонд Нацыянальнага мастацкага музея папоўніўся яшчэ адной работай вядомага мастака — яе падарыў унук Шрагі Царфіна Іў Дзювак, які прыляцеў на адкрыццё выстаўкі дзеда з Францыі. Таксама экспазіцыю наведала траюрадная пляменніца мастака Эла Царфін.

— Гэты праект вельмі важны, асабліва для мяне: я рос побач з дзядулем у асяроддзі яго палотнаў, — расказаў Іў Дзювак. — Я назіраў, як ён іх стварае. Гэта было



зачаравальна. Памятаю, як ён часта распавядаў пра свае Смілавічы, казаў, што там запомніў незабыўныя беларускія песні. І я хачу гэта перадаць сваім дзецям. Мае бацькі падарылі Нацыянальнаму мастацкаму музею «Вялікі блакітны рыф». І я вырашыў працягнуць традыцыю. На жаль, у мяне толькі «Маленькі рыф». Расставацца няпроста, але так будзе правільна.

ТВОРЧЫЯ КАМПАНЕНТЫ

Шрага Царфін як фігура мультыкультурная і мультынацыянальная з'яўляецца выдатным увасабленнем адкрытасці свету. Нарадзіўшыся ў Беларусі і пражыўшы большую частку жыцця за яе межамі, Царфін стаў грамадзянінам свету, таму яго творчасць — гэта ўвасабленне культурных сувязяў, якія ўсталяваліся паміж беларускім і замежным мастацтвам.

На выстаўцы адразу заўважаеш палітру. Яна як «аблічча» мастака. У кожнага сваё, непаўторнае. Што рабіў Царфін? Ён змешваў гуаш і алейныя фарбы. За гэта быў празваны алхімікам. У мастака былі розныя перыяды, што адлюстравана ў творчасці. Ёсць чырвоны стыль Царфіна, ёсць яшчэ сіні, зялёны і нават жоўты. Ёсць таксама і жанравыя сцэны ў палях, дзіўна падобныя на жывапіс беларускага «суровага стылю» і адначасова на творы Басава.

— Гэта першая такая вялікая персанальная выстаўка Шрагі Царфіна ў Беларусі, — раней паказвалі асобныя яго работы на групавых выстаўках. І гэта для краіны сапраўды падзея, — адзначыў куратар выстаўкі Юрый Абдурахманаў. — Царфін, напэўна, адзіны, хто ў сваіх успамінах кажа пра тое, што ён з Беларусі. Бо, як правіла, усе мастакі (якія праславіліся ў Парыжы) выязджалі з Расійскай імперыі і звычайна казалі, што родам з Расіі, і гэта дазваляе нашым расійскім калегам лічыць іх сваімі.

Адна з вядучых тэм у творчасці Шрагі Царфіна — пейзажы Францыі, якая стала яму другой радзімай. Мастак імкнуўся перш за ўсё ўзняць духоўныя і філасофскія праблемы, якія яго хвалявалі. Царфін быў выдатным каларыстам, ён выкарыстоўваў своеасаблівую індывідуальную палітру, выпрацоўваў пазнавальную тэхніку, увесь час знаходзячыся ў пошуку новых выразных сродкаў. Яго творы знаходзяцца ў многіх музеях Францыі, калекцыях баронаў Ротшыльдаў і сям'і Чарлі Чапліна.

ГІСТАРЫЧНЫЯ ФАКТЫ

Маляваць мастак пачаў у раннім дзяцінстве. У 1900-х гадах быў знаёмы з Хаімам Суціным. Праз трыццаць гадоў сябры зноў сустрэліся ўжо ў Парыжы. У 1913 годзе Царфін, ідучы па слядах Суціна, паступіў ў Віленскую мастацкую школу, але ўжо ў 1914 годзе з'ехаў у Палесціну. Там вучыўся ў Школе мастацтваў Бецалель, працаваў у кібуце. У 1918—1920 гадах служыў у брытанскай арміі, ваяваў за вызваленне Палесціны ад Атаманскай імперыі.

Пасля заканчэння Першай сусветнай вайны Царфін вярнуўся ў Бецалель, удзельнічаў у шэрагу выставак. Жадаючы працягнуць адукацыю, у 1923 годзе з'ехаў у Берлін, а ў 1924-м перабраўся ў Парыж. Тут займаўся самаадукацыяй, пачынаў супрацоўнічаць з выдавецтвамі і дамамі мод, выстаўляўся ў Салоне Незалежных. Хутка Царфін ажаніўся, у 1931 годзе сям'я атрымала французскае грамадзянства.

У 1930-х гадах Царфін актыўна працаваў як мастак па тэкстылі. Крытыкі да сённяшняга дня называюць яго «віртуозам эскізаў для тканіны». У гады Другой сусветнай вайны амаль усе работы мастака 1920—1930-х гадоў бясследна зніклі — толькі эскізы для тканін цудам захаваліся ў шэрагу прыватных архіваў. Дарэчы, на выстаўцы ў Мінску прадстаўлена некалькі такіх эскізаў.

Падчас Другой сусветнай вайны Царфін спачатку служыў у французскай арміі, затым дэмабілізаваўся і ўдзельнічаў у Руху Супраціву. Нават у гэты складаны час адбыліся тры яго персанальныя выстаўкі: у Грэноблі (1941) і ў Ліёне (сакавік і ліпень 1942-га).

У 1945 годзе сям'я Царфіна вярнулася ў Парыж, пасля чаго пераехала ў Роні-су-Буа, маленькае мястэчка блізу французскай сталіцы. Жыццё ў пасляваеннай Францыі, разбуранай і разрабаванай нацыстамі, было вельмі складаным, але менавіта ў гэты час Царфін успомніў параду свайго сябра Хаіма Суціна і цалкам прысвяціў сябе жывапісу. Яго творчасць усё больш адлюстроўвала напружанае ўнутранае жыццё мастака, асабліва пасля таго, як ён даведаўся пра гібель бацькоў у Смілавіцкім гета. Толькі пасля 1960-х гадоў мастаку ўдалося пераадолець унутраны душэўны крызіс, яго работы паступова пачалі ззяць блакітным колерам, напаўняцца спакоем.

Памёр мастак у 1975 годзе пасля працяглай хваробы, пахаваны на могілках Роні-су-Буа. Пасля смерці многія знаёмыя і блізкія творцы пісалі пра яго ўспаміны, дзе адзначалі містыцызм і імкненне да інтэлектуальных зносін: Шрага Царфін шмат чытаў, падарожнічаў, знаёмячыся з новымі краінамі і людзьмі.

Вікторыя АСКЕРА

ЛАБАРАТОРЫЯ СВЯТЛА

У Нацыянальнай бібліятэцы працуе святочная выстаўка

Карціны, якія выпраменьваюць святло! У час, калі ўвесь свет захоплівае святочная атмасфера, у Нацыянальнай бібліятэцы заззялі «Калядныя званы». Гэта назва незвычайнай выстаўкі. Карціны ў літаральным сэнсе свецяцца знутры. Новы кірунак сучаснага жывапісу і мае адпаведную назву — святлізм. Падобныя элементы можна знайсці ў знакамітых мастакоў Шагала і Малевіча. Заснавальнікам святлізму ў сучасным беларускім мастацтве лічаць Рыгора Іванова. Майстар кажа, што, каб сагрэць думкі, яму патрэбны толькі алейныя фарбы.

Святлізм — калі сама карціна і ўсё ў ёй выпраменьвае святло, гэта адчуванне, працэс, пры якім чалавек у сабе адкрывае пачуццё святла, сам робіцца святлом.

На першы погляд работы жывапісца могуць здацца простымі і немудрагелістымі, але на самай справе іх стварэнне патрабуе шмат працы і яшчэ больш шчырасці. Яны ўносяць у наша жыццё тое, чаго так не хапае, — цяпло, пяшчоту і радасць, цуд і гармонію. У работах аўтара амаль фізічна адчуваецца пульсацыя колераў.

— Святло для мяне — сімвал Бога. Я звязваю святлізм з верай. Мне часам здаецца: глядзіш на твор, і ён як лекі, прыняў — і дапамагае ад смутку, журбы, цемры. Святло ўсіх аб'ядноўвае, — расказвае Рыгор Іваноў. — У кожным маім творы закладзена стыхія. У мяне калісьці была выстаўка «Водары колеру», гледзячы на карціны якой здавалася, што адчуваеш водар кожнай работы. Гэта ўсё асацыяцыі. Так і ў дадзеным выпадку: чалавек, гледзячы на святло, знаходзіць у ім сваё чараўніцтва, якое, напрыклад, не ўбачу я. У маіх работах ёсць свабода. Няма прывязкі да канкрэтнага сюжэта, ёсць фантазія і ўяўленне. «Калядныя званы» — таксама ўнутранае свята, якім хачу падзяліцца з іншымі.

Мастак працаваў у розных напрамках, але ж абстракцыя стала для яго найбольш блізкай. Аўтар падкрэслівае, што яна лепш развівае ўяўленне.

Свае работы Рыгор Іваноў падзяляе на тры ўзроўні. Першы — паверхня рэальнасці. У творах прысутнічаюць людзі, можна ўбачыць размежаванне колераў, выразныя грані, якія паступова знікаюць, а карціны выпраменьваюць святло. Другі ўзровень — у іх бачны знак маланкі. Прачытваецца сілуэт. Вобраз маланкі мы пераносім на сябе ў цэнтр святла — сонечнае спляценне. Адразу адчуваецца энергія, сіла. Трэці ўзровень для аўтара — вяршыня, адчуванне, што дасягнуты абсалют. Тут прысутнічае пульсацыя і вібрацыя за кошт святла, і чалавек нібы трапляе ў метафізічную прастору.

— Кожны з гэтых узроўняў выцякаў адзін з аднаго. Увесь працэс заключаецца ў тым, што я як мастак стаў адыходзіць ад матэрыяльнага, абстрагавацца ад навакольных фактараў. У маіх работах паступова стала заставацца толькі святло, — тлумачыць мастак. — Фарміраваць кірунак святлізму я пачаў у 2015 годзе. Да гэтага часу была больш фігуратыўная рэальнасць, але пошук у абстракцыі я не кідаў. Свой шлях творчасці я часам параўноўваю з лабараторыяй. Таму што гэта пасапраўднаму навукова-даследчая праца.

У архіве мастака ўжо больш чым паўтысячы работ. Карціны Рыгора Іванова, акрамя Беларусі, знаходзяцца ў музеях Швейцарыі і ЗША, а таксама ў прыватных калекцыях па ўсім свеце. Выстаўка ў Нацыянальнай бібліятэцы працуе да 1 лютага.

Вікторыя АСКЕРА, фота аўтара

Вярнуцца да вытокаў праз глыбіню жаночай душы

Украінскі *Etna Fashion* у Мінску як прыклад раскрыцця славянскай прыгажосці

Дзейнасць Пасольства Украіны ў Рэспубліцы Беларусь становіцца ўсе больш актыўнай і насычанай. Толькі за апошнія тры месяцы ў Беларусі адбылося каля дзесяці знакавых мерапрыемстваў, прысвечаных культуры і самабытнасці ўкраінскага народа. 11 снежня ў Мінск літаральна на тыдзень прывезлі выстаўку вядомага ўкраінскага дызайнера Кацярыны Патловай *Ethno Fashion by Potlova*, прысвечаную жаночай прыгажосці і ўнікальнасці. Праект адкрылі ў Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры».

Сярод экспанатаў — 40 партрэтаў сучасных украінак, але кожная работа — з нацыянальным каларытам. На шырокафарматных фотаздымках, зробленых у межах праекта, жанчыны Украіны (зоркі шоу-бізнесу, вядомыя прадстаўніцы культуры і мастацтва, палітыкі, спорту, а таксама валанцёры, жанчыны з інваліднасцю, і інш.) прадстаўлены ў прыгожых традыцыйных нацыянальных вобразах: з вянкамі з кветак, у яркіх упрыгожваннях і этнічных сукенках.

Ethno Fashion by Potlova — праект унікальны. Дзякуючы яму ва ўкраінскіх жанчын з'явілася магчымасць вярнуцца да сваіх вытокаў, звярнуцца да велічнай гісторыі народа, якая сягае далёка ў стагоддзі, дакрануцца да ўласнай культуры і традыцый. Як адзначае аўтар выстаўкі Кацярына Патлова, такі праект дае магчымасць ёй і яе камандзе з задавальненнем паназіраць за перастварэннямі, якія адбываюцца з удзельніцамі падчас здымак. Гэта дае жанчынам магчымасць максімальна праявіць сябе, падкрэсліць сваю ўнікальнасць і індывідуальнасць, раскрыць уласныя новыя, нязведаныя грані.

— Калі быць сумленнымі, то мы прывезлі гэты фотапраект у Беларусь, каб паказаць, наколькі ярка і арыгінальна можна падкрэсліваць прыгажосць, індывідуальнасць, — адзначыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Украіна ў Рэспубліцы Беларусь Ігар Кізім. — Пакуль я не бачыў падобнага ні ў адной краіне. Гэта напрамак этнафэшн, які дазваляе рабіць праект цікавым для рознай узроставай аўдыторыі. У кожнай фатаграфіі закладзены пэўны сэнс, пэўная эстэтыка, якая паказвае не проста прыгажосць жанчыны, а яе грацыю, вытанчанасць, нават інтэлектуальнасць. Галоўнай задачай для нас было — паказаць прыгажосць у розных праяўленнях. Паглядзіце на партрэты. Мы можам убачыць на некаторых дзяўчыну ў інвалідным крэсле, але партрэт не дэманструе яе праблему, ён адлюстроўвае прыгажосць. Шмат акцэнтаў зроблена на адзенні, якое, здавалася, калісьці перастала быць цікавым грамадству. Але тут яно пададзена ў іншым ракурсе, і, паглядзіце, крой зайграў іншымі фарбамі.

Гэта праект, дзе раскрываюцца індывідуальнасць, самабытнасць, этнічная прыналежнасць. Сімбіёз сучаснасці і традыцый, фальклорных матываў, аксесуараў у нацыянальным стылі і сусветных трэндаў дазволілі аўтару праекта ў поўнай меры стварыць партрэт сучаснай украінскай жанчыны, адухоўленай і моцнай, пяшчотнай і трапяткой. Гэта смелы эксперымент, у якім, як расказала Кацярына Патлова,

можа ўзяць удзел кожная жанчына, якая хоча пераўвасобіцца і захаваць сваё цудоўнае ператварэнне на натхняльных фота. Каманда Кацярыны стварыла партрэты сучаснай украінскай жанчыны як захавальніцы мудрасці пакаленняў, якая валодае сілай духу, непарушнай воляй і ўнутранай свабодай.

— Я асабіста натхнёная яркасцю гэтай выстаўкі, яе выразнасцю. Вобразы, якія стварыла аўтарская каманда для кожнай жанчыны, непаўторныя, — падкрэсліла дырэктар Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» Марына Татарэвіч. — Гэта важная асаблівасць *Ethno Fashion by Potlova*. Сукенка, вышыўка, аксесуары, манікюр і нават макіяж — усё толькі для адной жанчыны. Гэта ж велізарная праца, якая патрабуе шмат фантазіі і крэатыву. Самае цікавае, што на выстаўцы мы можам прасачыць не толькі трэнды кірунку этнафэшн, але і ўзроставы перыяд кожнай з удзельніц: дзесьці ў вочы кідаецца маладая дзяўчына, а можна ўбачыць жанчыну, якая адбылася ва ўсіх сферах жыцця, і натхніцца яе харызмай, эмацыянальнасцю. Таксама у экспазіцыі можам убачыць шматдзетных мам, якія зачароўваюць унутранай прыгажосцю. Дарэчы, праект дазваляе нам пераняць досвед у нашых суседзяў, успомніць пра агульнасць славянскай прыгажосці. Мне здаецца, такі праект для беларускіх жанчын таксама быў бы цікавы.

У якасці месца для здымак аўтарская каманда выбірала лакацыі, багатыя на зеляніну і кветкі, якія сталі выдатным жывым фонам для ўвасаблення ў жыццё запланаваных ідэй. У наступных сезонах у якасці лакацый праекта будуць выкарыстоўвацца пляцоўкі паркаў і музеяў у этнастылі, дзе пануе атмасфера нацыянальнага каларыту. Акрамя таго, Кацярына Патлова вырашыла распрацаваць унікальныя стылізаваныя студыйныя фотазоны з адпаведным антуражам і рэквізітам.

Праект існуе з 2015 года. За гэты час творчай камандай было створана каля 300 непаўторных вобразаў. У планах Кацярыны Патловай — яшчэ не адзін сезон. Дарэчы, на выстаўцы ў Мінску анансавалі, што наступны сезон будзе прысвечаны гісторыі Кіеўскай Русі, дзе вялікую ўвагу нададуць вобразам княгінь.

Вікторыя АСКЕРА

Калейдаскоп колераў і настрояў

Парадаксальнасць вобразаў у работах Марыі Пяшкун

Творчасць Марыі Пяшкун — гэта сакавітая палітра тыпажоў і тыпаў, шырокі спектр эмоцый і пачуццяў, стракаты яркі калейдаскоп настрояў. Мастачка захоўвае на палатне і паперы як рэальных людзей, так і зборныя вобразы, выдуманых герояў, персанажаў казак, міфаў, фантазій і сноў. Ёй усяго 17 гадоў, але ж гэта не перашкаджае мастачцы паўнавартасна аддавацца творчасці. Зусім нядаўна ў Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» ў Мінску адкрылась другая персанальная выстаўка Марыі «Хаос маіх думак», дзе аўтар прадставіла работы, якія, па яе меркаванні, дэманструюць формулу асабістых змен у творчасці. У экспазіцыі прадстаўлены жывапіс, графіка, накіды і некалькі работ у тэхніцы «ляўкас».

Назва экспазіцыі выдатна адлюстроўвае сутнасць работ аўтара. У фантастычных і казачных вобразах пераважаюць яркія і насычаныя колеры. На палатне быццам бы звыклыя чалавеку вобразы скажаюцца да непазнавальнасці. Часты прыём мастачкі — выкарыстанне гульні слоў у назвах твораў для стварэння парадаксальнага вобраза. Напрыклад, карціна пад назвай «Ікона стылю». Як адзначае сама Марыя Пяшкун, на гэтай выстаўцы сабраны найлепшыя яе работы. Прычым яны даволі разнастайныя.

Марыя з сям'і мастакоў, але мае свой арыгінальны почырк. Часта сутыкаецца з крытыкай, аднак усе роўна працягвае ісці наперад і развівацца.

— Вядома, у маіх работах ёсць пэўнае падабенства з творчасцю бацькоў. Бо я ж з імі заўсёды побач, бачу, як яны малююць, чым захапляюцца, — расказала Марыя Пяшкун. — Я заўсёды назіраю за імі, падкрэсліваю, якія мне падабаюцца дэталі жывапісу, што ў іх цікавага. У мяне не было мары або жадання працягнуць справу сям'і, усё атрымалася само сабой. Зараз я, напрыклад, стараюся ў прынцыпе не глядзець на работы мамы і таты, а вывучаю ўвесь свет мастацтва. Мне падабаецца *modern-art*, у яго апошнім часам і паглыбляюся.

Чым цікавая творчасць Марыі, дык гэта пабудовай мастацкіх метафар і фарміраваннем унутраных стратэгій твораў. Напрыклад, на выстаўцы можна ўбачыць аўтапартрэты мастачкі, створаныя на выкарыстанні процілегласці. Адзін аўтапартрэт пабудаваны як эстэтычнае фота: прыгожы сілуэт, вытанчаныя лініі твару, ідэальна пастаўлены ракурс. Другі паказвае адваротны бок, праз які разбураюцца ўсе стэрэатыпы папярэдняга кадра.

— Мне падабаецца шукаць розныя стылі. І я не ўяўляю сябе мастаком без далейшага развіцця, — дзеліцца аўтар. — Можна вывучаць гістарычны аспект, можна паралельна шукаць актуальныя напрамкі ў сучаснай арт-прасторы. Напэўна, галоўнае — быць рухомым, не ленавацца. Сёння я дакладна ведаю, што мяне чапляюць яркія работы, у якіх

«Мой фетыш». 2019 г.

не проста майстэрства мастака, а гісторыя, глыбокія перажыванні, спантанная думка.

Адрознівае стыль Марыі Пяшкун здольнасць ствараць колеравы настрой. Як гэта? Насамрэч, усё даволі проста: па пэўным колеры можна зразумець, пра што кажа мастачка. Увогуле, ёсць адчуванне, што сама маладосць аўтара дае запал яе работам. Яны энергічныя, эмацыянальныя. Галоўнае, што ў іх няма абыякавасці альбо проста жадання эксперыментаваць. Марыя сапраўды стварае жыццё ў сваіх творах.

Сёння аўтар вучыцца ў каледжы мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка. Шмат чытае і малюе і ў будучыні жадае развіваць свае здольнасці. Мастачка ўжо ўдзельнічала ў пленэрах «У пошуках Атлантыды» і пленэры імя Язэпа Драздовіча. Работы яе выстаўляліся ў межах міжнародных праектаў у Расіі, Кітаі, Танзаніі, Іспаніі, а карціны былі набыты *Caso de los gatos* museo (Ларэта-дэ-Мар, Іспанія). У Беларусі Марыя неаднаразова прымала ўдзел у выстаўках «Панна DOLL'я» у Мінску, Віцебску, Брэсце, Азярцы і Лепелі. У 2015 ў кавярні «*CoolCoffee*» прайшоў паказ яе карцін пад назвай «Машанька і мядзведзі», а у 2018 адбылася першая персанальная выстаўка ў салоне «Грай кафэ».

Вікторыя АСКЕРА

Ад аўтэнтыкі да эстрады

Сям'я ў любым выпадку павінна быць вялікай агульнай працай, людзі ўнутры яе натхняюць і падтрымліваюць адно аднаго. Часта творчыя калектывы становяцца сапраўднымі сем'ямі, але ў нашым выпадку сям'я стала творчым калектывам. Нядаўна народнаму сямейнаму ансамблю «Жывіца» споўнілася 25 гадоў. Аб тым, як калектыў стварыўся і жыве цяпер, распавядае яго кіраўнік Юрый Крывашэй.

— Раскажыце пра гісторыю стварэння калектыву.

— У нас у Пухавіцкім раёне ёсць Борскі сельскі Дом культуры, які раней называўся клубам. У 1993 годзе працаваць сюды прыйшлі мая цётка Таццяна і бацька Юрый. У канцы года яны разам з маёй бабуляй Зінаідай стварылі фальклорны ансамбль, у які ўваходзілі людзі розных прафесій. У 1994 годзе ансамбль даў першы канцэрт. Пасля гэтага пачалася гастрольная дзейнасць: выязджалі ў розныя вёскі, суседнія раёны. Спявалі акапэльна. Потым прыйшла працаваць мая маці Наталля. Да 2010 года гэты ансамбль існаваў, хоць удзельнікаў станавілася менш.

І ў 2010 годзе так атрымалася, што сярод удзельнікаў калектыву засталася толькі наша сям'я — бацькі, цётка, дзядзька і бабуля. І нам прапанавалі з'ездзіць на абласны фестываль сямейнай творчасці «У родзе ўсё ў згодзе» ў Салігорску. Пасля гэтага фестывалю нам прысвоілі статус сямейнага ансамбля. Пачалася актыўная гастрольная дзейнасць, з 2013 года сталі выязджаць за мяжу. Мы спявалі, як цяпер кажуць, пад мінус. А ў 2016-м нам прапанавалі ўзяць планку вышэй і атрымаць званне «Народны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь». У лютым 2016 года гэтае званне атрымалі. У канцы 2016 — пачатку 2017 года ансамбль пашырыўся: уключылася інструментальная група.

— Атрымліваецца, што вы выраслі разам з гэтым ансамблем. У які момант вырашылі працягваць справу сваёй сям'і?

— З самага дзяцінства. Заўсёды было вельмі цікава, калі ўсе збіраліся на канцэрты. Я на сцэне з чатырох гадоў. Мяне аддалі ў музычную школу па класе баяна, потым пайшоў вучыцца ў Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў на аддзяленне народных інструментаў. Спецыфіка ў тым, што там атрымліваеш адукацыю не толькі як музыкант, але і як арганізатар сацыякультурнай дзейнасці. Вучыўся спачатку як баяніст, потым пачаў асвойваць іншыя інструменты: і народныя духавыя, і некаторыя струнныя. Пасля паступіў ва ўніверсітэт культуры і мастацтваў на кафедру духавой музыкі, бо зацікавіўся менавіта беларускімі духавымі інструментамі. За гэты час я навучыўся рабіць апрацоўкі, стаў прымаць удзел не толькі ў сваім сямейным ансамблі, але і ў многіх іншых фальклорных групах. Падчас вучобы трапіў у капэлу беларускіх народных духавых інструментаў «Гуды» пад кіраўніцтвам Ігара Мангушава. Граў з народным ансамблем «Харошкі», з аркестрам Жыновіча, было вельмі шмат паездак і канцэртаў, але гэта ўсё не перашкаджае мне займацца маім сямейным калектывам. Пасля ўніверсітэта пачаў працаваць там афіцыйна.

— Чаму менавіта вы сталі кіраўніком ансамбля, а не хто-небудзь са старэйшых сваякоў?

— Кіраўніком стаў я, таму што толькі ў мяне ў сям'і ёсць профільная музычная адукацыя.

— А ў пастаноўках нумароў, канцэртаў вы займаеце месца рэжысёра ці ўсё робіцца разам з калектывам?

— Заўсёды ўсё робім разам: усе прапануюць розныя ідэі, якія ўплятаюцца ў адну канву. Можна сказаць, што асноўная частка ідэй ідзе ад мяне, таму што я знаходжу нейкія песні, раблю іх апрацоўкі. Кожны ж калектыў павінен мець свой твар, а не спяваць аднолькавыя песні пад капірку. З маёй падачы рэпертуар пашырыўся — у нас з'явіліся яўрэйскія, украінскія, рускія кампазіцыі. Рэпертуар наш наогул вельмі разнастайны: ад аўтэнтычных абрадавых песень да эстрадных.

— Як калектыў уплывае на адносіны ўнутры сям'і?

— Гэта вельмі моцна згуртоўвае. Мы, атрымліваецца, маем зносіны паміж сабой у іншым амплуа: не толькі сям'я, але і калегі. Размовы часта круцяцца вакол калектыву: што зрабіць, як зрабіць. Канцэрты таксама моцна ўплываюць на гэта. За год у нас праходзіць каля 80 канцэртаў — прычым сольных, па гадзіне або больш. Бывалі моманты, калі ў дзень у нас было па тры або чатыры канцэрты. Некаторыя доўжыліся пяць гадзін.

— Чым вас прыцягвае народная музыка?

— У мяне з дзяцінства ўкладалася, што менавіта з дапамогай народнай музыкі мы ўяўляем Беларусь. Праз народную музыку на самай справе вельмі шмат чаго праходзіць. Шмат аспектаў жыцця. У гэтых песнях адлюстравана ўсё: і каханне, і праца, і многае іншае. Гэтыя песні дазваляюць зазірнуць у сутнасць жыцця.

— Што для вас прынцыповае ў працы?

— У першую чаргу захаванне лакальнай культуры на нашай тэрыторыі. Некаторыя калектывы бяруць усё і адусюль і не заўсёды захоўваюць тыя вакальныя асаблівасці мясцовасці, перарабляюць нават словы, што для нас недапушчальна. Мы стараемся гэта захаваць, хоць і падаём шырокаму гледачу ў трохі іншым амплуа, але асноўны пласт застаецца нязменны.

Асаблівасць нашага калектыву — гэта яшчэ маёй бабуляй закладзеная традыцыя: мы ніколі не развучваем партыі. Кожны спявае так, як чуе, і ўсе галасы зліваюцца. У нашай вакальнай групе прафесійных музыкаў няма. Але інструментальная група ўся складаецца з прафесіяналаў, больш за тое, амаль усе яны мультыінструменталісты.

— Падзяліцеся планамі на будучыню.

— Планаў шмат. У гэтым годзе мы прымалі ўдзел у святкаванні Дня незалежнасці ў Палацы Рэспублікі, у адкрыцці II Еўрапейскіх гульняў, удзельнічалі ў галоўным абласным фестывалі «Напеў зямлі маёй», у якім наш сумесны з ансамблем «Крыніца» нумар заняў другое месца. У планах, вядома ж, захаваць гэты ўзровень. З часу, як калектыў стаў яшчэ і інструментальным, рэпертуар пашырыўся, і сам ансамбль стаў больш прафесійны. У нас ёсць задумка паспрабаваць рабіць каверы, як цяпер папулярна. Ёсць ідэя зрабіць, напрыклад, канцэрт рэтра пад народныя інструменты.

Фота Наталлі Пархомчык.

Нядаўна паспяхова прайшоў наш юбілейны канцэрт. У нашым раёне даволі складана сабраць залу (выступалі ў Пухавіцкім раённым цэнтры культуры). Але да нас прыйшло шмат людзей, і гэта было вельмі прыемна. Адразу пасля канцэрта прадстаўнікі абласнога цэнтра народнай творчасці сказалі нам: «Вы граеце 19 снежня на юбілеі Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур у Нацыянальнай бібліятэцы». Мы будзем прадстаўляць Рэспубліку Беларусь. Планы пачынаюць рэалізоўвацца.

Гутарыла Дар'я СМІРНОВА

ВЯРШЫНЯ МАСТАЦКАСЦІ І НАТХНЕННЯ

Мінскі дзяржаўны музычны каледж імя М. І. Глінкі адсвяткаваў 95-годдзе

Юбілейны святочны канцэрт адной з найстарэйшых сярэдніх спецыяльных музычных навучальных устаноў Беларусі аб'яднаў у вялікай зале Белдзяржфілармоніі музыкантаў і педагогаў некалькіх пакаленняў. Мінскі дзяржаўны музычны каледж святкуе 95-годдзе з дня заснавання ўстановы. На працягу доўгага шляху развіцця нацыянальнай музычнай культуры, падрыхтоўкі яркіх выканаўцаў і музыкантаў установа была і застаецца адным з цэнтраў музычнага жыцця сталіцы.

Гісторыя каледжа бярэ свой пачатак у далёкім 1924 годзе, калі Цэнтральны выканаўчы камітэт БССР прыняў рашэнне аб стварэнні Беларускага дзяржаўнага музычнага тэхнікума. «Многія пакаленні педагогаў і музыкантаў стваралі традыцыі кампазітарскай, выканальніцкай і музыказнаўчай школы Беларусі. Іх імёны складаюць гонар тэатраў і творчых калектываў», — адзначыў у сваім звароце да слухачоў дырэктар музычнага каледжа Уладзімір Чэрнікаў. Больш за дзевяць тысяч выпускнікоў выйшла са сцен гэтай цудоўнай установы, многія імёны залатымі літарамі ўпісаны ў летапіс нацыянальнага музычнага мастацтва. Гэта народныя артысты Беларусі Эдуард Зарыцкі, Міхаіл Фінберг, Яраслаў Еўдакімаў, Віктар Вуячыч, заслужаныя артысты Віктар Скарабагатаў, Алег Мельнікаў, Генадзь Забара, Уладзімір Радзівілаў, Уладзімір Ткач, Генадзь Фралоў, Якаў Навуменка і іншыя.

Слаўны шлях стварэння і станаўлення МГМК імя М. Глінкі быў адзначаны ганаровымі граматамі і словамі падзякі ад начальніка ўпраўлення культуры Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Віталіны Рудзікавай, прарэктара па навуковай рабоце ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта Нэлі Мацаберыдзэ, а таксама Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Румыніі ў Рэспубліцы Беларусь Віярэла Машану.

Музыка вялікага рускага кампазітара Міхаіла Глінкі, чыё імя з гонарам носіць музычны каледж, стала сімвалічным абрамленнем юбілейнага канцэрта. Свята адкрыў канцэртны хор Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. І. Глінкі (дырыжор Аляксей Снітко), у выкананні якога прагучаў хор «Слаўся» Міхаіла Глінкі. У «Вячэрняй музыцы» з харавой сімфоніі-дзейства «Перазвоны» выдатнага сучаснага кампазітара Валерыя Гаўрыліна слухачам адкрылася вечная прыгажосць жыцця. Харавое гучанне дапаўнялася пранікнёным выкананнем салісткі — выпускніцы каледжа Ксеніі Баршчовай.

З музычным юбілейным віншаваннем выступіў лаўрэат міжнародных конкурсаў, уладальнік заахвочвальнай прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі ансамбль скрыпачоў «Капрыс» (кіраўнік Галіна Арабей, канцэртмайстар Вольга Луневіч). У выкананні ансамбля прагучала музыка З. Фібіха «Паэма» і М. Кажлаева «Палёт скрыпак». Кантрастам тэмбравых гучанняў стала выступленне ансамбля флейтыстаў «Флюід» (кіраўнік Аляксандра Рэнанская) і ансамбля ўдарных інструментаў (кіраўнік Ілья Сцяпанаў).

Больш за сто гадоў аддзяляе творчасць Фелікса Мендэльсона, яго «Скерца з музыкі» да камедыі У. Шэкспіра «Сон у летнюю ноч», якое прагучала ў выкананні ансамбля флейтыстаў, і музычныя шэдэўры для ўдарных інструментаў бразільскага кампазітара Нэй Разаўра. Канцэрт №1 для марымбы з аркестрам гэтага кампазітара ў перакладанні для ўдарных інструментаў саліравала выпускніца МДМК імя М. І. Глінкі, лаўрэат міжнародных конкурсаў, цяпер студэнтка Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага інстытута культуры Аліна Бадзяка.

Кульмінацыяй юбілейнага канцэрта стала «Песня пра Нёман» (муз. Н. Сакалоўскага), якая прагучала ў выкананні аркестра беларускіх народных інструментаў Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. І. Глінкі (дырыжор Уладзімір Чэрнікаў) і яго выпускніка Станіслава Трыфанава. Слухачы былі зачараваны магутным лірыка-драматычным сапрана салісткі аркестра Ніны Шарубінай (У. Браілоўскі «Адрас майго кахання»).

У святочным канцэрце, прысвечаным 95-годдзю Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. І. Глінкі, узялі таксама ўдзел сімфанічны аркестр (мастацкі кіраўнік Мікалай Макарэвіч), хор спецыяльнасці «Дырыжыраванне», хор спецыяльнасці «Спевы акадэмічныя» (мастацкі кіраўнік Кіра Славінская), народны хор (мастацкі кіраўнік Ганна Мілавідава), лаўрэат міжнародных конкурсаў, дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, выкладчык каледжа Алена Асташкіна-Мысліўчык (фартэпіяна), навучэнцы МДМК імя М. І. Глінкі — дуэт баяністаў Ягор Працэўнікаў і Эдуард Юхнік (клас выкладчыка У. Л. Гурба-Новіка), лаўрэат міжнародных конкурсаў Магдалена Васіленка (скрыпка, клас выкладчыка В. Г. Кісялёвай), партыю фартэпіяна выконвала дыпламант міжнародных конкурсаў Вольга Маркевіч.

Імя кампазітара Аляксандра Цыганкова, бліскучага выканаўцы на домры, шырока вядома ў музычным свеце. Асноўная лінія ў яго творчасці — апора на народную песню, танец, інструментальны найгрыш. На працягу вось ужо некалькіх гадоў лідзіруючыя пазіцыі ў сольным выкананні на домры займае выпускнік каледжа Аляксей Аўчыннікаў, які таксама, як і яго любімы кампазітар, паказаў на канцэрце прыклад адданасці свайму інструменту і народна-песеннаму жанру.

Завяршыла юбілейны канцэрт выступленне сімфанічнага аркестра каледжа, якім вось ужо больш за 10 гадоў кіруе мастацкі кіраўнік і дырыжор Мікалай Макарэвіч. Музыка М. І. Глінкі вянчала вяршыню мастацкасці і натхнення, яднанне з традыцыямі класічнай музыкі і накіраванасці ў будучыню музычнай культуры. І сёння, як і 95 гадоў таму, мы імкнёмся дасягаць, а дасягнуўшы, зноў імкнёмся.

Са святам, каледж!

Наталля КАРДАШОВА

Саўлюс ВАРНАС:

«Людзей вучыць таямніца»

Ідучы ў тэатр, мы чакаем сустрэчы з таямніцай. Але наўрад ці задумваемся пра тое, што самую галоўную таямніцу носім у сабе. Тэатр можа яе абудзіць ці, наадварот, заглушыць. Рэжысёр Саўлюс Варнас умее ствараць таямніцы: яго спектаклі патрабуюць разгадкі, а ключ кожны падбірае сам — у залежнасці ад ведаў, досведу, уяўлення і настрою. Саўлюс Варнас ведае пра таінства сутворчасці: яго спектаклі ўцягваюць гледача ў дыялог. Ніхто не абяцае, што гэты дыялог будзе просты і прыемны. Але ж таямніцы — як перліны — схаваныя глыбока. Каб дастаць іх з дна мора, трэба нырнуць, надоўга затаіўшы дыханне... Аб таемных магчымасцях тэатра мы гаворым з рэжысёрам, якога добра ведаюць у Беларусі.

— Вы працавалі ў многіх краінах, некалькі гадоў былі галоўным рэжысёрам Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра. Ці ўзнікла адчуванне нацыянальнага характару беларускага тэатра?

— Мне здаецца, нацыянальны характар беларускага і літоўскага тэатра шмат у чым падобныя. Бо ўсе мы вучыліся спасцігаць асновы і таямніцы прафесіі па сістэме Станіслаўскага — у адной з найлепшых еўрапейскіх тэатральных школ. Ёсць, вядома, і адрозненне беларускага і літоўскага тэатра: у літоўскім тэатры спектаклі больш вобразныя, метафарычныя, больш візуалізаваныя. Але я хацеў бы адзначыць вялікую працавітасць акцёраў у беларускім тэатры. І не толькі акцёраў, таму што за час сваёй працы бачыў шмат людзей, якія рабілі значна больш, чым прадпісана іх абавязкамі. Цаню гэтыя якасці і шаную такіх людзей. Зараз настаў час, што большасць імкнецца рабіць як мага менш або не рабіць наогул нічога, але грошай пры гэтым хоча атрымаць як мага больш...

Па-рознаму, вядома, працуецца з рознымі калектывамі, тым больш у розных краінах. Але бліжэй за ўсё і па менталітэце, і па тэмпераменце мне Беларусь. Цаню час, які правёў тут, і адносіны, што склаліся з людзьмі, досвед, які набыў, і веру, што нейкім чынам наша супрацоўніцтва працягнецца.

— Пры тым, што вы пакінулі Беларусь, тут шмат вашых прыхільнікаў. Ці магчымы для вас варыянт пастаяннага супрацоўніцтва з нейкім беларускім тэатрам?

— Гэта магчыма, вядома, калі запросяць. Бо калі мяне пытаюцца: «Дзе вы працуеце?» — я адказваю: «У Літве і ў Беларусі». Я працаваў у многіх краінах, але гэта былі асобныя пастаноўкі. Для мяне вельмі важна, што і як адбываецца ў беларускім тэатры. Тым больш што ўсё побач: з Вільнюса ў Мінск прыехаць хутчэй, чым даехаць да Клайпеды.

— Што, на ваш погляд, патрэбна нашаму тэатру, каб актывізаваліся творчыя працэсы?

— Цяпер у беларускім тэатры выбух маладой рэжысуры: у асноўным новыя ідэі сыходзяць ад стваральнікаў лялечнага тэатра. А лялечнікі ў Беларусі вельмі цікавыя — яны канцэптуалісты, далёкія ад бытавога мыслення. Цікавыя маладыя людзі прыйшлі з розных сумежных галін — з пантамімы, тэатра танца, лялечнага тэатра, з рэжысёрскіх курсаў тэатральнага інстытута. Усе яны імкнуцца выказаць сябе, прадставіць свой светапогляд, разуменне мовы тэатра і такім чынам станоўча ўплываюць на працэс развіцця сучаснага беларускага тэатра. З прычыны спецыфікі ў лялечнікаў па-іншаму будуецца праца з акцёрамі, чым у драматычным тэатры, але ўпэўнены, што з часам яны знойдуць свой метад працы з артыстамі — з рухамі энергій. Гэта ж складана — нібы вышэйшая матэматыка, але задача па сілах, калі не адступіць. Бо глядач і прыходзіць дзеля гэтай асаблівай ежы — дзеля абмену энергіямі...

— Калі вы зараз апынуліся ў Беларусі, значыць, ёсць задума, праект, матэрыял, які хочацца паставіць тут і цяпер?

— Усяму ў жыцці ёсць свой час. І ў тэкстаў, якія выбіраю, да якіх рыхтуюся, таксама наступае свой час — свет пачынае адгукацца, і раптам раздаецца званок з Партугаліі, з Тэгерана, з Мінска... У Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры мы абмяркоўвалі некалькі міжнародных праектаў, якія маглі б зацікавіць і беларускага гледача, і міжнародныя фестывалі. Таксама абмяркоўваў варыянт пастаноўкі «Півоневая альтанка» для Пекіна. У інсцэніроўцы іх тэатра сюжэт нагадвае «Рамэа і Джульету» Шэкспіра, але цікава было б злучыць два гэтыя тэксты, два сюжэты. Таксама мяне вельмі цікавіць суфійскай літаратура — яна геніяльная як з пункту гледжання сэнсаў, так і музычным гучаннем слова. Калісьці ў войску разам са мной служыў хлопец з Баку, ён мог гадзінамі чытаць тэксты Румі. Тады я і захапіўся музыкай гэтых тэкстаў... Ды і само разуменне тэатра ва ўсходняй культуры зусім іншае, таму абмен ідэямі і досведам можа быць вельмі плённы. Думаю, што прыйдзе час і для ўвасаблення выдатных тэкстаў Метэрлінка, Блока, Андрэева...

Перыяд у Магілёве для мяне быў цікавы, насычаны і адначасова манаскі: паркі, самотныя прагулкі на прыродзе, каля манастыра, каля ракі. Усё як у дзяцінстве... Я з чацвёртага класа кожны дзень зімой праходзіў на лыжах 7 кіламетраў да лесу і столькі ж назад незалежна ад надвор'я. Аднойчы была завіруха, мама спрабавала мяне спыніць. Я ўсё роўна пайшоў. Памятаю, што рабіў 4—7 крокаў, а потым клаўся на снег, каб сабрацца з сіламі — такі моцны быў вецер. Прайшоў гэтыя кіламетры, пераадольваючы і вецер, і самога сябе. Але радасць была неймаверная, калі дасягнуў лесу, і сілы хутка аднавіліся — дадому вецер прынёс мяне сам, трэба было толькі ўстаць і скіраваць лыжы ў патрэбным напрамку. У жыцці выпадаюць такія эпізоды, якія фарміруюць характар, асабліва важна мець іх як мага больш і прайсці ў дзяцінстве.

Беларусь для мяне — важны этап у жыцці. Я сустрэў тут шмат цікавых, таленавітых асоб, і не толькі акцёраў, зносіны з якімі не спыняюцца. Было паразуменне з дырэктарам і адміністрацыяй тэатра, што вельмі не проста, калі трэба ўзгадняць фінансы і мастацтва. Удавалася акунуцца і ў цішыню — калі можна было проста ўслухоўвацца ў яе гучанне. Бо для гледача спектакль — таксама цішыня, толькі ўнутраная, калі ў душы нараджаецца адкрыццё.

— Кнігі даюць такую магчымасць?

— Тады ў мяне не было часу на кнігі. А вось за гэтае лета я перагартаў шмат цікавай літаратуры, вельмі рады гэтаму. Напісаў вялікі артыкул — агляд духоўнага пошуку чалавецтва ад біблейскіх часоў да нашых дзён. Мне самому цікава было паспрабаваць разабрацца ў гэтым. Бо калі ў чалавека няма таго, за што ён гатовы аддаць жыццё, то чаго тады і жыць?.. Мне хацелася прасачыць развіццё гэтых ідэй ад біблейскіх часоў і да сённяшняга моманту, каб зразумець, куды далей павінна рухацца наша грамадства. Нядаўна навукоўцы з групай студэнтаў Гарвардскага ўніверсітэта пратэсціравалі жыхароў племені амазонскіх джунгляў на ўзровень інтэлектуальных здольнасцей. Ніхто не чакаў, што ў выніку непісьменныя жыхары амазонскіх джунгляў сваімі інтэлектуальнымі здольнасцямі перасягнуць студэнтаў элітнай ВНУ, а гэта адбылося. Вядома, тэсты былі падрыхтаваны розныя, але па складанасці яны адэкватна адлюстравалі агульны узровень. Тут ёсць пра што падумаць…

— Тэатр — мастацтва, здольнае ўплываць на чалавека, дзе б ён ні жыў, сёння тэатр можа гаварыць пра самае важнае…

— Чалавецтва прайшло няпросты шлях ад дзікай прыроды — праз шаманскія практыкі да найвышэйшых тэхналагічных дасягненняў і вялікіх духоўных прасвятленняў, сведчанні пра якія былі ў Ведах, зараастрызме, егіпецкім жрэцтве, кабале і ў рэлігіях будызму, хрысціянства, ісламу. Гэта было адлюстравана нават у розных відах мастацтва. Калісьці амурскія шаманы павінны былі акунуцца ў сем палонак, а сібірскія шаманы ў лёгкай вопратцы сыходзіць у трыццаціградусны мароз на тыдзень у тайгу, або ў егіпецкіх школах праходзілі вельмі складаныя выпрабаванні, ныраючы паміж кракадзіламі, каб атрымаць права на лідарства — права заклікаць сваё племя, свой народ на духоўны шлях развіцця і весці яго па гэтым шляху. Тэатральнае мастацтва патрабуе не меншай рашучасці — ахвярнасці. Гэта ж таксама свайго роду пустэльніцтва дзеля ўсвядомленай патрэбы заклікаць да духоўнага развіцця.

Спектаклі павінны развіваць у гледача інтуіцыю, уяўленне, асацыятыўнае мысленне і — самае галоўнае — абуджаць, развіваць творчы пачатак, які закладзены ў кожным чалавеку. Калісьці я пачуў словы «нам больш не патрэбны творцы — нам патрэбны спажыўцы» і ўспрыняў іх як няўдалы жарт. Але, на жаль, з кожным годам больш відавочна, што гэтыя словы спраўджваюцца. Мы жывём у час тэхнароў і менеджараў. Але пры ўсім прагрэсе і дасягненнях у навуцы гэты час можа стаць згубным для ўсяго чалавецтва. Як лічаць навукоўцы, да 45-га года XXI стагоддзя ў свеце застанецца 20 адсоткаў занятага справай насельніцтва, а астатніх чакае доля бяздзейснага жыцця з выплатамі дапамог, што прывядзе да дэградацыі гэтых людзей, як і любое бяздзейнае жыццё, у той час як іншыя могуць патрапіць у спіс нежаданых, ад каго таксама знойдзецца спосаб пазбавіцца. Памерці — не самае страшнае, што можа быць у жыцці... Усё ж такі застаецца надзея, што здаровы сэнс дапаможа чалавецтву пераадолець бацылу суіцыду і ўсвядоміць простую ісціну: калі прырода дазволіла засяліць планету такой колькасці народу, значыць, не проста так. Значыць, усе патрэбныя, хоць мы і не можам пакуль у поўнай меры ўсвядоміць, навошта, — магчыма, паўстануць задачы, для вырашэння якіх неабходныя усе гэтыя людзі…

Але выклік ёсць, і мы павінны яго прыняць — зноўку знайсці адказ на найважнейшае пытанне пра сэнс жыцця. Зараз ужо і вучоныя прыходзяць да той жа думкі, якую людзі мастацтва ведалі заўсёды: сэнс нашага з'яўлення на зямлі — знаходжанне ў няспынным творчым стане, у нараджэнні новых ідэй, новых светаў... А ўсё гэта рухае час, і ён сам рухомы гэтым, бо стварае магчымасць праявіць ідэі ў матэрыяльным свеце. Кожны з нас прыходзіць у гэты свет са сваёй закладзенай боскай праграмай, і кожную ноч падчас сну мы прымаем пэўныя карэкцыі — кіраўніцтва да далейшага жыцця.

Выдатна, што ў Японіі ёсць рэстараны, дзе ўжо не патрэбны персанал, які абслугоўвае кліентаў: ні кухары, ні афіцыянты і г. д. І калі такіх рэстаранаў у горадзе адзін або некалькі, то гэта надае месцу пэўны шарм. Але калі так працаваць пачнуць усе, то наўрад ці гэта ўзрадуе наведвальнікаў. Таму што яны прыходзяць у рэстаран не толькі паесці, але і дзеля кантакту — абмяняцца энергіямі... Бо энергія любові закладваецца і ў ежу, з якой добрыя кухары яе вырабляюць, — яны ж хочуць, каб стравы наведвальнікам спадабаліся. Кожная справа, якая падабаецца, робіцца з любоўю. А любоў і ёсць галоўная рухаючая сіла ўсяго, і ніякая тэхніка замяніць яе не здольная — яна ёю не надзеленая. Таму каштоўнае павінна быць само чалавечае жыццё. Час патрабуе стварыць умовы для рэалізацыі кожнаму жыхару планеты. Гэта выклік, але хіба гэта нам не пад сілу?!

На мой погляд, не правільныя словы вучаць людзей і нават не павучальныя ўчынкі, якія, безумоўна, добрыя самі па сабе. Людзей вучыць таямніца — тое, што невядома, што прымушае чалавека губляцца, адчуць сябе нібыта ў свеце сноў, і ён сам сваім разуменнем павінен дайсці да прасвятлення.

Ларыса ЦІМОШЫК

Скарбонка Спадчыны

Фота прадастаўлена дзяржаўнай установай культуры «Камянецкая раённая клубная сістэма».

Марыя Краўчынская падчас «Дажынак».

Лічба «два» —

ключавая ў падвойным ткацтве

Двухасноўнае (падвойнае) ткацтва было і застаецца найбольш цікавай і арыгінальнай з'явай беларускага народнага рамяства. Росквіт яго ў Камянецкім раёне прыпадае на другую палову XX стагоддзя. І сёння ткацтва — жывая з'ява.

Падвойныя дываны быццам складаюцца з дзвюх асобных тканін, якія спалучаюцца адна з адной па краях і ў месцах узору. Для асновы бяруць тоўстыя льняныя або баваўняныя ніткі, для ўтку — шарсцяную пражу хатняга вырабу. Прадзеныя ўручную ніткі надаюць дывану пэўную пругкасць, а ўзорам — рэльефнасць.

— Лічба «два» — ключавая ў падвойным ткацтве: двухколеравая гама дывана, два колеры нітак, якія закладваюцца ў кросны, два бакі дывана (у яго няма споду) аднолькава прыгожыя і акуратныя, — распавяла метадыст па народнай творчасці і фальклору дзяржаўнай установы культуры «Камянецкая раённая клубная сістэма» Наталля Дзямчук. — Толькі колеры паўтараюцца люстэркава: калі з аднаго боку жоўты ўзор на карычневым полі, то з другога — карычневы на жоўтым. Часцей за ўсё ўжываюцца ніткі чырвонага (і яго адценняў), зялёнага, сіняга, чорнага колераў. Звычайна выкарыстоўваюцца два кантрасныя колеры: зялёны — з карычневым або чырвоным, чырвоны — з фіялетавым або чорным і гэтак далей. Краі камянецкіх падвойных тканін звычайна заканчваюцца махрамі: на кароткіх баках — з прадаўжэння асновы, на доўгіх — давязваюцца з такіх жа нітак, як дыван.

Такой посцілкай можна карыстацца на абодва бакі, і праслужыць яна можа паўстагоддзя. А вось мыць дыван не трэба. Узімку кладуць на снег адным бокам, потым — другім — вось і ўсё мыццё. Тутэйшыя дываны перадаваліся ў спадчыну з пакалення ў пакаленне. Восем гадоў таму традыцыйная тэхналогія ткацтва падвойных дываноў вёскі Падбела Камянецкага раёна была ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

На Камянечыне традыцыі падвойнага ткацтва ўжо амаль паўстагоддзя захоўвае Надзея Грыцук, якая навучылася гэтаму рамяству ў сваёй маці. У 15 гадоў яна ўжо самастойна стварала посцілкі, працягвае займацца гэтым і сёння. На яе рахунку — больш як сто дываноў. З 2009 года Надзея Анатольеўна носіць ганаровае званне «Народны майстар Рэспублікі Беларусь».

— У Падбельскім сельскім Доме культуры ў 2000 годзе адкрылі першы ў раёне і Брэсцкай вобласці гурток падвойнага ткацтва, — зазначыла Наталля Дзямчук. — Надзея Анатольеўна, кіруючы ім, навучыла гэтай тэхніцы некалькіх майстрых. Сярод іх была і Марыя Краўчынская, якая, будучы дырэктарам Падбельскага сельскага Дома культуры, адна з першых у раёне пачала адраджаць элементы традыцыйнай культуры. Ужо праз шэсць гадоў падвойныя дываны Марыі Іванаўны экспанаваліся побач з вырабамі яе настаўніцы Надзеі Грыцук на II Нацыянальнай выстаўцы народнага мастацтва «Жывыя крыніцы».

Абедзве майстрыхі — асобы творчыя. Надзея Грыцук ужо пяць гадоў з'яўляецца майстрам-метадыстам Камянецкага сельскага Цэнтра рамёстваў і культуры, дзе навучае ўсіх жадаючых майстэрству падвойнага ткацтва і вырабляе сувеніры. Заўсёды ў пошуку, пастаянна імкнецца засвоіць нешта новае Марыя Краўчынская. Акрамя дываноў, займаецца ткацтвам ручнікоў і сурвэтак, стварэннем абрадавых лялек, пляценнем з бісеру. У Падбельскім сельскім Доме культуры кіруе дзіцячым гуртком бісерапляцення і гурткамі ткацтва, дзе не толькі дзеці, але і дарослыя засвойваюць асновы беларускага ручнога ткацтва, у тым ліку і падвойнага. У сваім рамястве жанчыны абапіраюцца на мясцовыя традыцыі, творча іх развіваюць, многія ўзоры ствараюць самі.

— Неад'емная частка работы загадчыцы Падбельскага сельскага клуба — экспедыцыйная і даследчая дзейнасць, выяўленне майстроў і ўмельцаў народнай творчасці, папаўненне этнаграфічнага пакоя, — падкрэсліла Наталля Дзямчук. — У Беларусі выраб традыцыйных двухасноўных дываноў, на жаль, амаль знік, але на Камянеччыне майстры прыкладаюць шмат намаганняў для захавання і развіцця ўнікальнага рамяства, брэнда нашага раёна. А яшчэ майстрыхі ствараюць у тэхніцы падвойнага ткацтва меншыя вырабы. Для кожнай пары года Марыя Краўчынская выткала абярэгі — Масленіца, Вясна, Лада, Купалінка, пасхальныя сувеніры.

Надзея Анатольеўна і Марыя Іванаўна — удзельніцы шматлікіх выставак, семінараў, майстар-класаў па ткацтве, фэстаў і святаў. Сярод іх — выстаўка работ майстроў народнай творчасці, прафесійных і самадзейных мастакоў «Край Берасцейскі — наша натхненне, гонар, любоў і краса» ў Мінску, Дзень беларускага пісьменства, абласны фестываль народнага мастацтва «Беларусь — мая песня». Майстрыхі — пераможцы і прызёры абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў у Беларусі і Польшчы. У прыватнасці, у 2007-м «за якасць і тэхналагічнасць» падчас абласнога свята-конкурсу ткацтва, вышыўкі і народнага касцюма «Узор дзівосны на палатне і кроснах» атрымалі дыплом I ступені, у 2013-м у V Рэспубліканскім фестывалі-кірмашы рамёстваў «Вясновы букет» — дыплом II ступені, у Рэспубліканскім конкурсе «Найлепшы беларускі сувенір», які праходзіў у 2010 годзе пры падтрымцы Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, занялі 1-е месца і інш.

— Традыцыя ткацтва на Камянеччыне існуе дзякуючы ўлюбёным у сваю справу майстрам, якія лічаць за прафесійны гонар выткаць не проста дыван, посцілку ці ручнік, а ў пэўным сэнсе прадмет мастацтва, — падкрэсліла Наталля Дзямчук. — Каб людзі захапляліся, ацэньваючы іх вырабы, каб традыцыя развівалася як каштоўны пласт нацыянальнай культуры.

Раіса МАРЧУК

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
намеснік галоўнага рэдактара — 377-99-72
адказны сакратар — 377-99-72
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 377-99-72
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
12.12.2019 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 941

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 4340

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.